КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 4



ВІЛЬНЯ 1935 ГОД.

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—4 зал., на паўгода—2 зал.
Адна кніжка—1 зал.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

ЗЬМЕСТ

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 4. **1935 г.** **Год I**

Я. ШУТОВІЧ

ПЕСЬНЯРЫ ЮБІЛЯРЫ

Кожны жывы народ выяўляе свае ідэалы, творыць розныя цэннасьці ў галіне грамадзкага жыцьця, а такжа на ніве навукі і мастацтва праз выдатных сваіх адзінак. І беларускі народ на працягу ўсей сваей гісторыі меў заўсёды здольных сыноў, што былі слаўны ў розных дзялянках ягонага жыцьця. Тымбольш мае ён іх сяньня, калі адбывае свой культурны і грамадзкі рэнэсанс. Прарокамі і пяўцамі гэтага рэнэсансу, яго душой, зьяўляюцца волаты слова, творцы беларускага прыгожага пісьменства: Янка КУПАЛА, Якуб КОЛАС і Зьмітрок БЯДУЛЯ-ЯСАКАР. Гэта буйныя літаратурныя індывідуальнасьці, гэта мастакі беларускага слова, гэта людзі, якімі беларуская літаратура, беларуская культура, ня можа не ганарыцца.

Сёлета Янка Курала і Зьмітрок Бядуля-Ясакар абходзяць свае юбілеі: першы 30-лецьце, другі 25-лецьце працы на беларускай літаратурнай ніве. І мы з гэтай нагоды, у пачуцьці ўдзячнасьці і сьведамасьці заслуг Юбіляраў перад беларускім народам, ягонай культурай, віншуем іх, жадаючы ім далей аставацца маякамі беларускай літаратуры, якімі яны былі дагэтуль.

Творчасьць Янкі Купалы і Бядулі-Ясакара, апроч мастацкіх вартасьцяў, мае вялікія вартасьці грамадзка-ідэовыя. Купала і Зьмітрок Бядуля-Ясакар не належаць да тае катэгорыі пісьменьнікаў, што твораць у імя „мастацтва для мастацтва“, — яны твораць пераважна з сьведамасьцю, што мастацкая літаратура выконвае функцыі грамадзкія. І з гэтага боку плод іхняй творчай працы ёсьць дужа характэрным, асабліва, калі застасуем крытэрый часу пры разглядзе ідэовай эволюцыі песьняроў, выражанай у тэй-жа творчасьці. У творчасьці Купалы і Бядулі-Ясакара, як у люстэрку, бачым мастацкае адлюстраваньне мамэнтаў, што характэрызуюць соцыяльнае, культурна-нацыянальнае і палітычнае палажэньне і жыцьцё беларускага народу, як і самых аўтараў. Галоўнай тэмай творчасьці Купалы і Бядулі-Ясакара ранейшага, дасавецкага пэрыяду часу (зборнікі вершаў: „Жалейка“, „Гусьляр“, „Шляхам жыцьця“, „Спадчына“, сцэн. творы: „Адвечная песьня“, „Паўлінка“, „Раскіданае гняздо“ і інш.— Купалы, зборнікі: „Абразкі“ (мастацкая проза), „Пад родным небам“,

(вершы), „На зачарованых гонях" (расказы) і інш.—Ясакара-Бядулі)—ёсьць уся нацыянальная Беларусь, беларускі народ, яго бацькаўшчына, з яго ворагамі социяльнымі і нацыянальнымі. Апроч таго ў гэтую пару Купала і Бядуля зьяўляюцца слаўнымі песьнярамі ідэолёгамі беларускага адраджэнска-вызвольнага руху. Яны даюць у поэтыцкай форме, сказаць можна, ідэолёгічныя каноны гэтага руху

Апынуўшыся ў савецкіх варунках жыцьця, яны перастаюць быць ідэолёгамі таго-ж руху і пад націскам палітычных існуючых там варункаў і камуністычнай ідэолёгіі — паволі адступаюць ад ідэолёгіі ранейшай і дапасоўваюць сваю ліру да новага ладу, да новага жыцьця, да існуючага там рэжыму, і ўрэшце Купала і Ясакар-Бядуля, як і чарада іншых беларускіх пісьменьнікаў, у сувязі з разгромам маскоўскім вялікадзяржаўніцтвам беларускага культурна-нацыянальнага руху ў Савецкай Беларусі—змушаны зрабіць над сабою ідэолёгічныя гаракіры, сплаціць дань часу: яны, як і многія іншыя беларускія пісьменьнікі, у 1930 годзе, у ведамых публічных лістох (Купалы з дн. 10.XII.30 („Зьвязда", з дн. 14. XII.30), Ясакара-Бядулі з дн. 30.XI.30 („Сав. Бел.", з дн. 7.XII.30) „прызнаюць" свае ідэолёгічныя ранейшыя „памылкі", каяцца за іх, выражаюць жаль і дэкляруюць вернасьць накінутай ім, як і ўсяму беларускаму народу, ідэолёгіі дыктатуры пролетарыяту.

Мамэнт „перабудовы" песьняроў—адлюстраваны ў творчасьці аднаго і другога па гэтым 1930 годзе.

Прадстаўнікі камуністычных на Беларусі ўладаў, а так-жа некаторыя прадстаўнікі камуністычнай пролетарыяцкай поэзіі і пісьменства агулам публічна сьцьвярджаюць, што партыя „перабудавала" Купалу і інш. беларускіх пісьменьнікаў.

Н. Ф. Гікало, сакратар ЦК КП(б)Б, у сваім выступленьні на нарадзе з беларускімі пісьменьнікамі у ЦК КП(б)Б 15.X.34 г. сказаў паміж іншым аб Купале і Коласе гэтак: „Яны становяцца іншымі людзьмі ў палітычных і іншых адносінах... Сяньня Я. Купала—гэта ня той чалавек, які быў некалькі год таму назад. Для нас Янка Купала, Якуб Колас — неадрыўная часьць літаратуры Савецкай Беларусі"... і—„гэта работа партыі ў цэлым і ваша камуністаў-пісьменьнікаў, а так-жа воля і жаданьне іх самых перабудавацца, пераглядзець свой палітычны творчы шлях на аснове рашэньня нашай партыі аб рабоце пісьменьніцкіх арганізацый" („Літаратура і Мастацтва" № 27, дн. 28.V.35).

Пасьля такіх „перабудаваньняў", Купала і Ясакар-Бядуля твораць на новы ідэйны лад. Тэматычна і ідэова творчасьць іх дапасоўваецца да творчасьці ўсесаюзнай у кірунку камуністычнай пролетарыяцкай ідэолёгіі.

Аднак міма ідэолёгічна новай накіраванасьці, міма палітычна-агітацыйных мамэнтаў у духу камуністычнай пролетарыяцкай ідэолёгіі, творчасьць Купалы і Ясакара-Бядулі найнавейшага пэрыоду мае вялікае значэньне і для беларускай нацыянальнай культуры, прадусім з гледзішча мастацкага і з гледзішча культуры слова.



ЯНКА КУПАЛА

ЯНКА КУПАЛА

З зборніка „Безназоўнае“
(Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, Менск, 1928).

* * *

... О так! Я—пролетар!..
Яшчэ учорах раб пакутны—
Сягодня я зямлі ўладар
І над царамі цар магутны!

Мне бацькаўшчынай цэлы сьвет,
Ад родных ніў я адвярнуўся...
Адно... ня збыў яшчэ ўсіх бед:
Мне сьняцца сны аб Беларусі!

БЕЗНАЗОЎНАЕ

4.

Было яно калісьці,
Калі, як жоўталісьце,
Жылі мы—ня жылі;
Ішлі дні без карысьці,
І сорам было выйсьці
У сьвет з сваёй зямлі.

Гнаў лісьце злосны вецер
Па полі, па ўсім сьвеце,
За вёску, за сяло:
На нас ляцела сьмецьце,
Бязладзьдзе, беспрасьвецьце,
Пятлю віло сіло.

І гэтакая слава,
Як пошасьці праява,
Буяла па людзях,
Пакуль жыцьцё ласкавай
Усьмешкай і забавай
Не асьвяціла шлях.

Заблісцацелі лужы,
Бяда зьвілася вужам...
—Ідзе,—крычаць,—вястун!
І ўзняўся нехта дужы,
І кінуў кліч дасужы—
Як помста, як пярун.

Ад воклічу прарока
Схіснулася памрока,
Сьцяг падняла вясна,
І па зямлі шырокай,
Як можа зьмерыць вока,
Пабегла навіна.

Сяляны і сялянкі!
Цацанкі-абяцанкі
Збываюцца для вас;
Выходзьце на палянкі,
Як зоры, як заранкі,
І сейце ў добры час.

5.

Мы ўсталі песьняй-казкаю
Пад жудаснай павязкаю
Мінулых чорных дзён
І ўдаль ідзём, хоць ляскае,
Зьвяр'ё ў кутох няласкаю—
На дальшы кліча сон.

Але, але ня выламе
Ні клыкамі, ні віламі
Таго, што ажыло,
Што ўскрэсла над магіламі,
Над хатамі пахілымі—
Мінуламу на зло.

Ня ўзяць рукамі голымі
Таго жывога полымя,
Што нібы агняцьвет,
Вясёлымі саколамі
Над горамі, над доламі
Разносіць іскры ў сьвет...
. . . .

А гоні ўжо узораны,
І сілы распакораны
Ад паншчынных бядот.
Чакаюць стравы жораны—
Зярнятаў не замораных,
Чакаюць на ўмалот.

А лапці і анучыны
Адбэрсаны, адкручаны,
Куда маўчыць ціхом;
Спраўляюцца заручыны
Вясельніцы засмучанай
З вясёлым жаніхом.

Лявоніха .. мяцеліца...
Бяз памяці вяселіцца...
— Гэй, дзьмі ў дуду, дудар!
Аколіца-аселіца
Пад ногі сонцам сьцеліцца..
Збудзіўся гаспадар!...

8.

* * *

Трэба, трэба дзён нямала тысяч
З беларускім сэрцам, думай
Мерыць сьветы, каб вышэй узвысіць
Вызваленьне наша з глуму.

Бо цікуе злосны вораг
Тых, што спыняцца ня ў часе
У сваім паходзе ў зорах
І задрэмлюць на папасе.

10.

Пакінем спадчыну мы для патомкаў
Інакшую ад тэй,
Што ўзялі мы ад продкаў на абломках
Гісторыі сваей.

З інакшай думкай пойдзе ў сьвет і людзі
Патомак гэны наш:
Згібацца ўжо ня будзе і ня будзе
Піць з недапітых чаш.

Дасталі сьцежкі, ад якіх прапасьці
Маглі мы ў бяспуцьці,
А кінем бітыя шляхі да шчасьця,
Абы умецьісьці.

На продкаў плечах паўзрасталі вежы,
Дзе торг вялі за нас,
А мы патомкам нашым кінем межы
Без ашуканскіх крас.

Яшчэ пакінулі нам асьляпленьне,
Пашану да пакут,
А мы пакінем песьню вызваленьня
І вольны бацькаў кут.

З ПАЭМЫ „НАД РАКОЮ АРЭСАЙ“

(Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі,
Менск, ЛіМ 1933).

2. АБ МІНУЛЫМ

Крумкач глюгу зьвесіў
Над згніўшай калодай...
Прысьніла Палесьсе
Мінулыя годы.

Было тут калісьці—
Багнішчы-балоты,
У дрыгве прэла лісьце,
Асокі, чароты...

Ідзе чалавек там, —
Засмокча смугою,
Са стогнам і крэктам
Загіне з душою.

Зьвер блукае дзікі
Ў пагоды, ў імжакі,
Гусей дзікіх клікі,
Гадзюкі, вужакі...

Мядзьведзь смокча лапу
Ў бярлозе санліва,
Лось высунуў храпу,
Шукае спажывы.

Дзік ходзіць з дзічыхай,
За ім—табун воўчы.
Ўсялякае ліха—
Ўдзень белы і ўночы.

Там-сям човен вузкі,
Нібы дамавіна,
Прасунецца ў грузкіх
Катлінах-багнінах.

Адно з вясной яснай
Палесьсе ускрэсьне,
Спаткае няшчасна
Вясну і прадвесьне.

Свой сьпеў салавейка
Ў гальлі адшчабеча,
Аб шчасьці жалейка
Гаротна ад'енча.

Скукуе зязюля
Адвечнае ку-ку,
Паліча бабуля,
Ці шмат яшчэ мукаў.

А там зноў магілай
Палесьсе замоўкла,
Зноў сьпіць яго сіла
Пад багнай пажоўклай.

А людзі? а людзі?—
Іх мала-нямала,—
Упаўшыя грудзі,
Бяда ўсьлед навалай.

Між топкіх багнішчаў,
На выдмах пяшчаных,
Як на папялішчы,
Рад хат, бы курганаў.

Жывуць людзі ў хатах,
Плятуць сабе лапці,
Каб з торбай у латах
Пайсьці жабраваці.

Пад шум бесканечны
Бярозаў і соснаў,
Сахой недарэчнай
Аруць пясок млосна.

Іх розум балота
Трымае палонна,—
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

Легенды і казкі
Прыгонных законаў
Паўзуць мохам вязкім,
Багуньнем зялёным.

Праз леты і зімы
Паданьне йшло ў векі:
—Паляшукі мы,
А не чалавекі!

3. ЗАШУМЕЛА, ЗАГУЛО...

I.

Зашумела, загуло,
Бы зямлятрасеньне,
На палескае сяло
Пайшло утрапеньне.

Люду хмара наплыла,
Покліч птушы ўзьвіўся,
Небам сіняя імгла...
Скуль яны ўзяліся?

Украінцаў тут гурма
Й старабінцаў нашых
Набрыло, як на кірмаш,
На багнаву пашу.

Безьлік хлопцаў-звадыяк,
Дзядзькаў барадатых,
Пілы вострыя ў руках,
Тапары, лапаты.

Што-та будзе тут цяпер?
„Нічога ня будзе"!—
Хітра думалі ў чацьвер
Палескія людзі.

А ў нядзелю, чуць зара,
Сякеры запелі,
Ад лапат балот кара
Рвецца ў топкім целе.

Шум і гоман навакол,
Як на тым ігрышчы,
А лапаты рэжуць дол,
А сякера сьвішча.

Рыюць людзі топкі торф
У вадзе па пахі,
А у жылах бурліць кроў,—
Багна ім ня ў страхі!

Яны знаюць, што ўжо так
Ня быць, як калісьці,
Што пакінуць яны знак
Вялікай карысьці.

За канавай—як струна
Новая канава,—
Ўсе падобны, як адна,
І зьлева і справа.

Спанаваў зьвярыну страх,
Ад людзей страх гоніць—
Па тарфяньні, па карчах,
За гонямі гоні...

На гэктары абнялі
Канавамі нетры,
Далей мераць пачалі
Ўжо на кілёмэтры.

Магістралі прад табой —
Ня зьмерыць і вокам,—
Тарфянішча прад сяўбой
Блізкай, недалёкай...

Магістралі, дрэнажы
Шляхі ў багне значаць...
Ой, дарэмна варажыў
Паляшук няўдачу!

Не дабачыў паляшук
З хаты безваконнай
Дзён надходзячых бяз мук,
Бяз трудоў прыгонных.

Раскаваў балота з пут,
З дрыгвы непраходнай
Гераічны вольны люд
Працаю свабоднай.

II.

І ляжаць канавы.
Тыя магістралі,
Па іх воды рэчкай
Усё далей, далей...

Бягуць да Арэсы
Сярод яшчэ пустак,—
Цаліной балота
Залягае густа.

Магістралі складна
Шлях працерабілі,
А йшчэ шмат работы
Чалавечай сіле.

Каб зрабіць прыгоднай
Глебу ў самым дзеле,
Каб на полі роўным
Трактары запелі.

Каб высокі, буйны
На тарфяньні чыстым
Зашумеў чаротам
Колас залацісты.

Чакае Палесьсе
Людзей сьмелых, жвавых,
Каб прышлі і дружна
Ўзяліся за справу.

Рук яно чакае
Новых, гаспадарных,
Спаборнікаў стойкіх,
Брыгадаў ударных.

Яны хутка прыдуць,
Вогнішчы разложаць,
Да канца балота
З багны адварожаць.

Бо йдуць чуткі сільна
Па цэлай краіне,
Што адкрыты скарбы
Ў балотнай пустыні.

(„Зьвязда“ № 182, 12.VIII.35).

ЛЁН

Як на поле, на зямлю
Прышла раніца вясны,
Я пасеяла ў ральлю
Жмені зёран ільняных.

Неба сеяла цяпло,
Цёплы дожджык цярушыў,
Ў думках радасна было,
Беглі песьні ад душы.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як расьці стаў, як падрос,
Як лісткі ўзьняў да гары,—
Лён палола з раньніх рос
Да вячэрняе зары.

Сэрца ныла, бы з нуды,
Бы сама была ня ўся, —
Спадабала я тады
Брыгадзіра Міхася.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як адцьвіў ды як надзеў
Лён галоўкі на сябе,
Быў ня горш, як у людзей,
Мела шчасьце я ў сяўбе.

Рваць ішла яго ў снапы,
Пела песьні аб вясьне,
Брыгадзір лічыў капы,
Час ад часу моргаў мне.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Як ішла лён абіваць,
Пад нагамі цёрся жвір,—
Нібы семя арфаваць,
За мной сьледам брыгадзір.

А мой пранік лясь ды лясь
Па гліняным па таку,
Падышоў бліжэй Міхась,
Мне паклаў за стан руку.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

А як слала я лянок
На зялёным на лугу,
Дзе папаўся Міхасёк,
Цалавала на бягу.

Сэрцу лёганька было,
Цэлы сьвет—вясёлы рай,
Хоць і восень, а сьвятло
Так і льецца цераз край.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Зьмяла ў мяльніцы я лён,
Атрапала лён траплом,—
Засьвяціў, як цудны сон,
Лён шаўковым валакном.

Промень ясны загуляў
Па страсе і па сьцяне...
Хату новую стаўляў
Брыгадзір мой для мяне.

Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

(„Зьвязда“ № 169, 21.VII.35).

АЛЕСЯ

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.
Гаманіў бор сасновы
Ў вечары і ранкі,
Над калыскай ліповай
Пела калыханкі:
—Сьпі, засьні, мая дзетка,
Птушкі ўжо заснулі,
Сьпі, засьні, мая кветка,
Люлі, люлі, люлі!
—Сьпі, ня ведай трывогі—
Надыйдзе часінка—
На сваё ўстанеш ногі,
Мая ты дзяўчынка.
Будзеш кужаль ты прасьці,
Будзеш ткаці кросны,
Выглядаць долі, шчасьця
Ў маладыя вёсны.
Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай.
Паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчасьлівай краінай,
Над роднай старонкай.
Адчыняе вароты
Нябесным маршрутам,
Ці як ястраб з высотаў
Скача з парашутам.
І да сонца праз хвілю,
А ўсё вышай, вышай!
Самалётавым крыльлям
Воблакі калыша.
Стара маці днём, ночкай,
Марыць ля ваконца:
Ужо к прасьніцы дочка
Не зьляціць з-пад сонца.
Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Ляўкі, Аршаншчына.

ЯСАКАР-БЯДУЛЯ

З зборніка „Пад родным небам"
(Беларускае Коопэрацыйна-Выдавецкае Тавары-
ства „Адраджэньне", Менск, 1922).

ПАХОДНІ

На плітах алатырных залатых вякоў,
На сочнай глебе сказаў з княжацкіх учынаў,
На красках простых сьпеваў простых мужыкоў,
Над плоймай струнных гукаў гучных адпачынаў
Агнеюцца паходні.

Іх водблескі рунеюць многа соткаў лет,
Квітнеюць, як лілеі казачнай крыніцы.
А кожная з паходняў — сонца-сяміцьвет,
Якое мкнецца ўвышку, з яркай заранїцай
Спрачаецца удодні.

Адвечныя скрыжалі роднае зямлі
Хаваюць нашы скарбы, носяцца над краем,
Паказываюць жыва, як дзяды жылі,
Гавораць нам яскрава, што мы мелі, маем
Ад песьняроў-пракокаў:

Баянаў сын-насьледнік,—Ігара гусьляр,—
Пакінуў нам на славу песьні залатыя.
Праз восем праз сталецьцяў з краю ценяў, мар
Прышлі да нас, як госьці, птахі-гусьлі тыя,
Бы зьяньне праз аблокі.

Пад попелам пад пылам манастырскіх крат
Знайшлі стары паргамэнт песьняў пад заховай.
Народы і плямёны, кожны на свой лад,
Гардзіліся знаходкай Ігарава Слова,
Явангельлем славянаў.

Пад месяцам, пад сонцам Полацкіх капліц,
Пад сьпеўнымі званамі залачоных вежаў,
Пад паляўнічым рогам ў явах таямніц
Зьявіўся наш Скарына кветкай родных межаў,
Вясёлкай з-пад туману.

На мове паспалітай простых пастыроў
Тлумачыў ён прарокаў сказы сьвятапісы.
Жыў твор яго ў народзе, нібы ў жылах кроў,
Праменіўся над краем сонечнаю рысай,
Аздобаю нябёснай.

Пад замкам Гэдыміна над ракой Вільлёй
Яшчэ адзін тастамант славіў нашу долю:
То быў Літоўскі Статут. Праўдаю сьвятой,
Імпэтнаю Пагоняй мкнуўся ён на полі
І па даліне роснай.

Яшчэ было паходняў па дарозе шмат,
Якія нам сьвяцілі ў цемры доўгай ночы:
Вянок народных песьняў хварбамі багат;
І хмеліць сэрца, душу, зьяньнем сьлепіць вочы,
Вянок наш мятарутны.

Ці помніце вы песьні аб сваіх дзядох?
Ці бачыце паходні, родныя саколы?
Ці пойдзеце наперад па сьвятых сьлядох?
Ці будзеце сьвяціцца ў родным творчым коле?
Ці будзеце магутны?

1922 г.

---

* * *

Я—кропля вялікага творчага мора,
Я—іскра квяцістага полымя зораў,
Я—водблеск нябёсных адвечных прастораў.

Душа мая—песьня з сьвятога амбону,
Душа мая—краска ад Божай кароны,
Душа мая—водгульле Божага стогну.

А думы—вясны залатой агнявіцы,
А думы—зямлі жыватворчай крыніца,
А думы—лугоў аксамітных расіца.

Жыцьцё маё—сон бога дзіўных Калядаў,
Жыцьцё маё—цень лясуновых прысадаў,
Жыцьцё маё—шэпт чараўнічага саду.

Памру—не памрэ жыцьцедаўчая сіла,
Што дух мой пад неба да зорак насіла,
Што кіне вянок на нямую магілу.

1922 г.

З зборніка „Буралом"
(Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, Менск, 1925).

АРЛІХІ

І луналі сталёвыя дзьве самалёткі—арліхі,
І былі іх палёты ня ціхі:
Крахаталі, шыпелі, гудзелі і страшна і дзіка,
І была іх трывога вяліка.
І пагібель і гора бязьмерна скідалі усюды,
Гарады разьбівалі у груды.
Нібы прашчуры пекла, труцілі ўсё жудасьцю-страхам,
Непакоілі воблачным шляхам.
А гарматы насы, бы галовы з вады кракадылы,
Падымалі, равелі што сілы...
І плявалі агнём—не траплялі ў магутныя скрыдлы,
Ім страляць у паветра абрыдла.
Чырванелі арліхі тымчасам, бы ў небе зарніцы,
Сваім гульням ня зналі граніцы.
Іх сьмяшылі з зямлі алавяныя, грозныя гукі,
Іх сьмяшылі сьмяротныя мукі...
Гэй, адважны стралок, ты вартуеш іх зьнізу дарэмна.
Хіба толькі жартуеш нікчэмна!
Што ім знача, асілкам, твае пryткалётныя пчолы?
Лепей кінь—ня прыцэліш ніколі!

. . . .

Пальнуў раз і другі. Сам рвануўся ўгару ад імпэту.
Ой, арліхам зьмяніла плянэта...
Во пусьціліся ўніз вельмі хутка, бы рынулі з неба,
Нібы зьнішчыць зямлю ўсю ім трэба.
Гэтак падае ўніз злы каршун на слабую ахвяру.
Так кідаецца воўк на атару.
Хіба страшнага духа спужаліся ў хмарах туманных?
Нам ня трэба гасьцей тых нязваных.
Ой!
упалі
уніз.
Пацямнелі сталёвыя блескі,
І разбрызгаліся крыльлі у трэскі.
Аграмады абломкаў уткнуліся ў пухкае поле.
Ой, няма ім гульні сваёй болей.
Няжывымі ляжалі пілоты—адважныя людзі.
Былі ў іх пакромсаны грудзі.
А гарматны стралок пазіраў на здабычу паволі,
Нібы ведаў зараней іх долю.

1924 г.



ЯСАКАР-БЯДУЛЯ

З раману „Язэп Крушынскі“
(Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, Менск, ЛіМ 1932).

У дарозе

З абодвух бакоў дарогі сівы лес.

Дзе-ні-дзе паказваюцца ў далі хаткі. Асьнежаныя дахі—белыя кучмы. Павольна насоўваюцца на абшар сінявыя змрокі. Яны апускаюцца ледзь прыкметна, крадучыся. З бяздоньня вышыні кроплямі ваты ціха нізіцца дробны сьняжок.

Калматы конік і двое людзей на развалістых санках ледзь вызначаюцца з агульнага фону бела-сіняга абшару. Конь павольна і неахвотна трухае па дарозе. Вось вось спыніцца і далей ня пойдзе. Зусім ня чутно, як санкі рухаюцца наперад па мяккім сьнезе. Каб не бярозкі дзе-ні-дзе абапал дарогі, каб ня хаткі, каб не рознастайнага выгляду гаі і хмызьнякі, якія адсоўваюцца назад, магло-б здавацца, што фурманка застыла на адным месцы шэраватай кропкай. Ціха. Толькі калі не-калі ў мутнаватым малочнага колеру паветры праносяцца з зьбянтэжаным крыкам вароны.

Едуць бацька з сынам — Цыпрук Ярэмчык і Мікола.

Яшчэ ўдодні Цыпрук запрог каня і паехаў па сына ў Менск. Цяпер—дамоў. Між сабою мала гутараць. Кожны заняты сваімі думкамі. Справу пра „кусамол“ стары адлажыў да прыезду. Аб гэтым трэба гаварыць спакойна ды ў цяпле, каб добра раскумекаць... Мікола сядзіць побач з ім у вялізным жоўтым кажуху, пазычаным Цыпруком у суседа.

Лагодна і роўна падае зьверху сьняжок.

Хтосьці прасейвае праз вялізныя сіты пытляваную муку.

З восені Мікола дома ня быў. Цікава наведаць вёску, дзе нарадзіўся і вырас, паглядзець старую матку, усіх сваіх, суседзяў, Сёмку Солаха, які чамусьці застаўся сёлета дома.

Кіпела ўлетку праца ў гэтай вёсцы.

Звычайная сялянская праца сваім чынам, але гэта праца была асаблівая, нязвычайная. Мікола і яшчэ некалькі вясковых хлапцоў згуртавалі тады людзей на праўку грэблі. Цяжка было спачатку. Як пагаварылі аб гэтым перад вяскоўцамі, дык тыя думалі, што жартуюць:

— Сумна тады стане ў нас і ціха, як у пустцы.

— Цяпер прынамсі людзі зьбіраюцца, талакою падарожныя фурманкі з балота выцягваем.

— Наша быдла ня будзе мець на сабе адзнак, як асушым дарогу.

— Куды мы дзенем калы-струмэнты?

— Увыпадку вайны ворагу лепшую дарогу для пераправы зробім.

— Ды мы прывыклі да гэтага балота. Нам яно не перашкаджае.

А калі з тлумачэньняў пабачылі, што ўсур'ёз гавораць аб папраўцы грэблі, пачалі зноў аднеквацца.

— Я адзін нічога не зраблю.

— Часу няма гэтым займацца.

— Ня лёгкая гэта работа.

— Ці ўсе пойдуць?

— Я пайду, але няхай іншыя пачынаюць.

Страшна было людзям брацца за гэта. Ня ведалі, што лёгка можна будзе зрабіць...

Быў тады спынак паміж сенакосам і жнівом.

Можна было вырваць у лета некалькі дзён. Было цёпла. Сонца ярка сьвяціла. Абапал грэблі стаялі сьвежыя стагі, якія цягнуліся вежамі аж пад самы лес.

Мікола і Саўка і яшчэ некалькі хлапцоў з рыдлёўкамі ў руках пайшлі на грэблю. Пачалі капаць канаву. Прышлі некаторыя паглядзець на працу і пакпіць. Няёмка стала вяскоўцам. Спачатку яны бралі рыдлёўкі з рук дзяцюкоў:

— Каб тыя адсапліся.

Пасьля пайшлі дамоў па рыдлёўкі:

— Да вечару пакапаем...

За гэтымі прышлі яшчэ... Кожны думаў:

„Як-жа-ж так? сусед будзе працаваць, а я не?—сорамна“...

А як пачалі, дык ужо трэба канчаць:

— Дудкі! зробім!..

На другі дзень Мікола і Саўка зрабіліся галоўнымі „інжынерамі“. Працавала ўся вёска... Гуртам пракапалі абапал дарог глыбокія канавы. Талакою вазілі лапкі, жэрдзі, бярвеньне, пясок каменьне.

Шумна было і весела. Пры рабоце песьні зацягвалі. Пачне адзін на жарт, і падхопяць усе. Праз некалькі дзён было ўсё зроблена...

Мучыліся людзі тут гадамі, дзесяткамі год...

Горача было тады на сэрцы ў Міколы. Ён заўважыў, што ў Саўкі па новаму вочы блішчаць. Ніколі ў таго гэткай радасьці ня было.

Кончылі работу, і некаторыя са старых запыталіся:

— А што цяпер?

— Вось, каб так гаспадарку талакою... Мабыць, кіпела-б...— сказаў хтосьці.

— І гэта будзе!—крыкнуў Саўка.

— Іш ты, малакасос!

Падышоў да грэблі стары Цыпрук. Доўгім удумёным позіркам зірнуў на грэблю, на людзей. Пасмутнеў. Тупаўся туды і сюды і нешта мармытаў пад нос.

— Што ты, Цыпрук, квокчаш? Не падабаецца? Гэта-ж твой сынок прыдумаў!

Цыпрук махнуў рукой, быццам нешта такое згубіў, чаго ўжо ніколі ня знойдзе, і адышоў на некалькі крокаў.

Суседка тлумачыла:

— Кіятар Цыпруковы разбурылі. Ён-жа заўсёды першым прыходзіў вазы выцягваць з балота. Ён-жа тут гутаркі заўсёды з людзьмі заводзіў...

Мікола чамусьці пачырванеў, а стары бацька яго пры гэтых словах ажывіўся і давай апавядаць розныя прыгоды: як калісьці нейкі пан даў яму рубля за тое, што памог выцягнуць фаетон з балота; як воз яек хтосьці перавярнуў у балота; як часта коні ногі выкручвалі ў гэтым месцы; як пазнаёміўся тут з аграномам. Нарэшце Цыпрук плюнуў і сказаў:

— А ведаеце, добра, што навялі тут лад. Нямала і я гараваў тут над горам людзкім. Хадзем, Мікола, палуднаваць, ці што?

Усе зарагаталі з такога пацешнага канца Цыпруковай жаласьлівасьці да ранейшага топкага месца.

Пасьля гэтага вяскоўцы цэлы тыдзень адскробвалі закарэлую гразь з свае жывёлы...

Пацямнела.

Значна пасінеў абшар. Далі пачалі мутнець і зьлівацца з сіньню. Сьнег ціха падае, кладзецца роўным пластком на сьпіну каня, на сані і кажухі Цыпрука і Міколы.

З раману „Набліжэньне" *)

На мяккай канапе Шагал з гарбаром. Гавораць ціха. Гаспадыня часта ўваходзіць у гэты пакой. Ловіць паасобныя словы: „Петраград", „заводы", „забастоўкі", „партыя" „гасударственая дума", „пролетарыят". Ад такога лексікона яна нічога добрага не чакае. Яна гэта ведае яшчэ з Смаргоні, з бацькаўскага дому, калі ў тысяча дзевяцьсот пятым годзе туды езьдзіла ў госьці.

Смаргонь — як узбураны вулей. Забастоўкі па гарбарнях, дэманстрацыі на вуліцах. Усе крамы пазачыняны, як у сьвяточныя дні. Сьпяваюць: „Смело, товарищи в ногу", „Інтэрнацыянал", „Варшавянку". Над галовамі гарбароў палыхаюць чырвоныя сьцягі. На вуліцах мора людзей, шквалы ўзбуджаных галасоў.

Для „ўсьмірэньня крамолы" прыехалі аж дзьве сотні казакаў. Дзікія і злыя, яны гойсаюць па вуліцах. Ніхто ня выходзіць з кватэр. Вобыскі, арышты. Гарбары галадуюць, а не здаюцца, фабрыкі не працуюць. Весткі плывуць з розных гарадоў Расеі: у Вільні на вуліцах барыкады, тое самае ў Менску, Пецярбурзе,

---

*) „Полымя Рэволюцыі", кн. 8-я, 1934 г.

Маскве. Агульная забастоўка чыгуначнікаў. Кантаровічыха баіцца за брата. Цэлымі днямі яго дома няма, а калі зьявіцца на некалькі хвілін, дык паведамляе:

— Бярэм верх...

І зноў яго няма. Старая маці плача, і Кантаровічыха трывожыцца. А ён усё сваё.

— Бярэм верх...

Аднаго разу. Ноч. Вецер выганяе з гарбарняў на вуліцу смурод сырой скуры. Кружыцца галава ад паху розных адкідаў, што цэлымі горамі панакіданы на падворках заводаў.

І вось прыходзяць з вобыскам. Кантаровічыха адчыняе жандарам дзьверы. Хатнія трывожацца. А брат спакойны, хоць-бы што. Шукаюць па ўсей кватэры так старанна і павольна, аж дзівіцца трэба такой цярплівасьці. Жандары перакідваюць пасьцелі, мацаюць падушкі, пералістоўваюць кнігі, лезуць у печ, па сьценах стукаюць. У некаторых мясцох узьнімаюць дошкі з падлогі. Ніводнай скрынкі няма ў хаце, ніводнага гаршка, куды-б не паглядзела вока жандараў.

— Няма...

Злуецца жандарскі афіцэр, сам у пер'ях і пыле. Злуецца і пачынае крычаць:

— Шукайце! Павінна быць!

З ліхтаром у руках ідуць на гару. Там нямала працы перакідваць рознае барахло, што зьбіраецца дзесяткамі год. Скрыпіць пад жандарскімі нагамі столь.

— Няма...

Жандарскі афіцэр,—з кволым тварам, з блакітнымі вачыма, атрэсвае з сябе пыл, нібы кот, які выскачыў з сьметніка. З яго шыняля сыплецца пясок і пер'е. Ён тупае нагамі, кашляе ад пылу, лаецца ды крычыць:

— Шукайце! Ведаю, што ёсьць!

Бярэцца пад дзень. Ледзь шарэе. Над дамамі кружацца з крыкам вароны. Жандары, срогія і злосныя, ідуць у хлеў. Старая маці Шагала стогне і ўся дрыжыць, як у ліхаманцы. З кватэры нікога ня выпускаюць, ля дзьвярэй варта.

„Божа мой... Божа мой...“—шэпча старая.

З двара нарэшце чуваць жандарская радасьць.

— Знайшлі! Знайшлі!

Прыносяць у хату тоўсты вязак вузенькіх і тоненькіх лісткоў. Ужо зусім відна, калі прыгожы афіцэр піша нешта пры стале. Потым кпліва-ласкава кажа брату Кантаровічыхі:

— Апранайцеся і пойдзем.

Старая махае рукамі, як паломанымі крыльлямі:

— Куды? За што? За гэтыя паперкі?

У прыгожага афіцэра добры настрой. Ён шчыра сьмяецца і нават са спачуваньнем пазірае на старую. Нават брат, бледны і маўклівы, усьміхаецца на матчыны словы, спакойна апранаю-

чы паліто. Маці бяжыць да дзьвярэй з такім спрытам, нібы памаладзела раптам на трыццаць год.

— Ня пушчу! Сын ня вінават! Ён-жа толькі настаўнік...

Афіцэр жартуе:

— Кепскі настаўнік, калі па гэтых лістках людзей вучыць.

І такі ў жандара лагодны голас, і такія прыгожыя блакітныя вочы... Старая нахіляецца, каб злавіць яго руку.

— Даруйце, паночак, майму сыну... Ён больш ня бу-у-дзе...

Цяпер у брата Кантаровічыхі цямнеюць вочы, а голас, голас... Ніколі Кантаровічыха ня чула такога:

— Перастань!—крычыць ён да маці.—Перастань!

Жандары адцягваюць старую. Брат выходзіць. Кватэра як пасьля пагрому. Кантаровічыха злуецца на брата: „як селядца разарвала-б...“

— Хто яго прасіў лезьці здаровай галавой у такую хворую справу? Што яму гарбары? Ён-жа настаўнік. Родных не шкадуе...

Больш за тры гады яго ня было. Потым новая справа—правакатара шукаць. Дзякуючы таму, правакатару, дзесяткі людзей былі арыштаваны.

І хто ж бы мог падумаць—стрыечны брат—Мойшка Лібэрман... Ён на ўсіх мітынгах першы выступаў.. Гарачы такі... Строгі рэволюцыянэр... Ах, сволач! Па ўсіх гарадах Расеі потым шукалі. У тысяча дзевяцьсот дзесятым годзе яго знайшлі на Каўказе. Яго ўжо няма...

Толькі сёньня Кантаровічыха аб гэтым даведалася.

Праплылі гады. Бацькі Кантаровічыхі памерлі. Сёстры ў Амэрыцы. Смаргонь са сваімі гарбарнямі зьнішчана толькі што вайною. З усяе іхняе сям'і адзін брат застаўся, і то пад іншым прозьвішчам. Даўно ў Смаргоні ня жыве. Толькі каганецкім кажуць, што з Смаргоні прыехаў.

І зноў старое вылазіць наверх, як кавалкі жалеза з попелу пажарышча.

Ловіць Кантаровічыха з гутаркі гарбара і брата паасобныя словы—вядомыя ёй словы. — Плача. Яна старэйшая сястра. Яна яму—як маці. Гэтулькі цярпеў... Мабыць, забывае, забывае...

Кантаровічыха плача і пячэ коржыкі брату і гарбару на дарогу, плача і рыхтуе ім сыр і масла.

Дзівіцца Кантаровічыха:

Згарэла Смаргонь, дык яны па іншых гарадах робяць сваё ранейшае. Нейкія там ліцейшчыкі, ткачы—усё іх абыходзіць...

Былы гарбар і былы настаўнік выбіраюцца адгэтуль уночы пехатой на хутары. Добра, што няма ў хаце Шымана. Ён кудысьці паехаў з Сакалоўскім.

Шагал сказаў сястры, што паедуць у Менск, але з іхніх гутарак яна выпадкова падлавіла, што з Менска паедуць далей—ні то ў Маскву, ні то ў Петраград.

— Шыману ні слова не кажы, куды паеду, — просіць яе Шагал.

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

МІНУТЫ ТВАРЭНЬНЯ

Растуць у лесе вершы ўвечары...
Разлёгся лес імхамі, плесьняю...
Іду сьцяжынкай няпрыкмечанай
І цешу сэрца новай песьняю.

Нялёгка йсьці праз нетры слоўныя,
Якія лгуць .. Тварыць нязнанае
І рытмы праставаць няроўныя
І рыфмы узьдзіраць дзірванныя,
Шукаць мэтафары нязьменнае
У думках—жоўтых, пыльных хроніках
І ў словы выліваць штодзенныя
Глухія гутаркі сасоньнікаў.

А ўсё-ж твару я ў лесе ўвечары...
Цямнее лес сьцяною точанай.
Іду сьцяжынкай няпрыкмечанай
Па мхох расой вячэрняй змочаных.

Туман лажыцца між хваінамі,
Трасуць асіны пазалотаю
І цягне вільгацяй лагчыннаю,
Вадой стаячай і чаротамі.

Ўнізе, смалой наліты чорнаю
Ляжыць ставок, затканы плесьняю.

Іду, на гладзь гляджу вузорную
І цешу сэрца новай песьняю.

1935 г.

* * *

Ў ясна-зялёным блакіце стаялі
Лёгка замглёныя восені далі.

Гаснучы, сыпаўся дзень пазалотай
З неба на тонкіх бяроз пераплёты.

Чырваняй кволай, старой акварэлі
Клёны й асіны у лесе гарэлі.

Дзень дапаліўся і цемра нядбала
Ў шэрасьці фарбы жывыя схавала.

Лес у густым неправідным тумане
Ў змрок адыйшоўся, як шэрае зданьне.

Цёмна .. Бярозы нявідныя ў полі
Сыплюць асеньнія сьлёзы паволі.

Ўслухайся ў плач іх жальлівы, шумячы,
Ці разумееш у шэрым тым плачы,

Што яшчэ нехта у вечар туманны
Разам з табою тужыць па нязнамым.

1935 г.

У ЗАДУШКІ

Ў размоклым ад дажджоў паветры,
Паміж крыжоў-туманных зданьняў
Міргаюць сьвечкі жоўтым зьяньнем
На хваравіта-ўпартым ветры.

Няма ўжо Вас... Вы там, няўрокам,
Дзе сьвецяць зоры серабрáна,
Ці чорнатканыя туманы
Хаваюць дзень... Вы дзесь далёка...

Калісь і ў Вас вясна нясьмела
Цьвіла й дымілі срэбрам далі,
І над крыжамі красавалі
Калін галіны квола й бела...

Калісь і ў Вас гудзела лета
Ў гарачы поўдзень гудам пчолаў,
І пахла мёдным пахам зёлаў
З магілак сонцам разагрэтых.

А вось цяпер з упартым ветрам
Стаіць асеньні змрок над Вамі
І плача вечар пад крыжамі
Ў размоклым ад імглы паветры.

Няма ўжо Вас... Гдзе Вы?—Ў нязнаным...
Ці лепей там, ці можа горай,
Вы нам ня скажаце... З пакорай
Прыймаем Вашае маўчаньне.

Няма ўжо Вас... І толькі ласка
Жывых — дрыжаць над Вамі сьвечы,
Ды вецер на крыжох калечыць
Вянкі з рудых, асеньніх краскаў.

1935 г.

---

* * *

Я ня жыву вясной,—рунеюць сенажаці,
Курэе сіні дым над кратамі палёў
І за мяне цьвіце у сонцавых абняцьцях
Празрысты белы пух вярбін і тапалёў.
Я й летам ня жыву,—бо за мяне сінеюць
У полі васількі і гнуцца каласы
І жаляцца—пяюць на жоўтых пожнях жнеі,
Маўляў маёй тугой дрыжаць іх галасы.
А ў восені ізноў—замест мяне—асіны
Чырвоны гасяць жар у рэдкім тумане.
І плача дробны дождж так нудна і няўпынна
Па сонцу і вясьне, але... замест мяне.

АСЕНЬНІ ДЗЕНЬ

Ад палёў паўзе холад восені,
Над рудым жніў'ём, над пракосамі
Мгла зьвіваецца.

Ў сон зямлі цяжкі, змораны
Сыпле дробны дождж зярнё спорнае,
Увіхаецца...

Час праз рукі йдзе ніткай шэраю,
Ніткай шэраю яго й мераю,
Ў'ю і блытаю...

А здалёк, з туманоў непамяці
Устае, каб ізноў мяне раніці
Пазабытае..

(З „ПРААБРАЖЭНЬНЯ“)

X.

То ня чырвоны сьвет вячэрні,
Ня цені згубленых надзей,
Хрыста замучанага церні
Ў вачох разбуджаных людзей.

То край зарою палымнее,
Крынічыць сэрца гневу муць
І словы ў песьні сонцавеем
Бруяць, вірацца і плывуць.

О, Край няволі і пакуты!
Старая мудрасьць шэрых хат,
Твае цярпеньні перакуты
Ў Адраджэньня моцны гарт.

Другое сьніцца цяпер нівам,
Другі размах сялянскіх дум
І захлынаючысь прылівам
У сэрца б‘е змаганьня шум.

То ня чырвоны сьвет вячэрні,
Ня цені згубленых надзей, —
Усходзіць сонца Адраджэньня,
У процьме гінуўшых людзей.

СЬПЯЧЫ ВОЛАТ

Я—сплю... Скавала мяне змора.
Усё зьнясу. Усё прыму.
І крыўды боль, і зьдзек і гора:
Пакуль я—сплю.

Мой сон даўгі—лічу вякамі...
Мой сон цяжкі—бяз руху я,
А злыдні ўсьцяж вартаўнікамі
Спакою—сна.

Згасіла ноч у хвалдах чорных
Душы агонь і жар крыві.
Ляжу зьняможаны, пакорны—
Мяртвец—жывы.

І толькі стада груганова
Усьцяж кружыцца і крычыць.
Дарма!.. Я толькі сплю—ізнова
Паўстану жыць!

Я чую ўздым пад зморай соннай
Ў маіх грудзёх магутных сіл,
Ўкладу я іх ў размах разгонны
Растучых скрыл.

— — — — — — — — — — — — — —

Ты бог начы і чорнай перамогі,
Хаўтур над сонным не спраўляй.
Прачнуся я—і выйду на дарогу
Спаткаць свой май.

А. БЯРОЗКА

ПЕРАДАВЫМ

Ад палёў вам прывет, ад шырокіх палёў,
Што калосяцца хваляй зярністаю,
Калі золак у сініх вачах васількоў
Пэрлы росаў запаліць іскрыстыя,
Вышы неба жаўрук гымнам раньня зальле,
Лісьця шопатам бор запяе...

І прывет вам ад шэрых, пахіленых хат,
Хат, што сонца спрадвеку ня бачылі;
Ім нядоля—сястрыца, і голад ім—брат;
А вякі на іх твары назначылі
Крыжам мукі крывава праўраны сьлед...
Ад пахіленых хат вам прывет!..

І працоўны прывет вам ад сэрцаў нямых,
Ад грудзёў, што ў баі ўзгартаваліся;
Ўжо з іх нетраў ня выйдзе нявольніцкі ўздых!..
Яны ў гордую ціш закаваліся,
Хоць мазольны і горам усланы іх пуць...
Вам свой братні прывет яны шлюць.

22.VIII.35

АДЛЁТ ЖУРАЎЛЁЎ

Верасьнёвае сонца гуляе
На іх крыльлях — і ціха, тужліва
Крыльлі йграюць у ветры, як струн пералівы...
Сумна крыльлі у ветры йграюць...

Вольны покліч далёка нясецца
Па блакіту бязьмежных шляхох...
Там, далёка дзесь, родны астаўся парог...
Крыло моцнае з ветрамі б'ецца...

І лятуць... А пад імі тугою спавітыя
Палі сьпяць у васеньняй дрымоце...
А іх крыльлі, блакітам залітыя,
Верасьнёвае сонца залоціць...

11.IX.35.

---

* * *

Пяі аб вясьне!
Хоць зімовыя ветры гудуць
І хоць сэрца трывогі абселі;
Хоць сьнягамі загнаны твой пуць
І надзеі ледзь тлеюць ў паўсьне
І ў змаганьні ўжо грудзі змадзелі...
Няхай злосныя ветры гуляюць
Ломяць слабае, ветлае гнуць,
Хай шумяць і равуць,
Хай сьнягі на палёх уздымаюць...
Ты пяі аб вясьне!
Чары сонца у песьню закуй і вагні,
Што вулканам бурляць у крыві,
Як калісь, ажыві,
Аб былым ўспамяні.

Не сагнуцца пад бурай сьцюдзёнай
Плечы волатаў з нашых загонаў
І у іх мазалістых руках
Не пахіліцца высака ўзьнесены сьцяг!

Дык хоць кудаса вые,
Вер, што ноч і зіма праміне,
Вер у сны веснавыя
І пяі аб вясьне!

18.XI.35.

А. ЧЭМЕР

На чужыне...

Рознакалёрнымі ўзорамі мігцяць ліхтары і рэклямы. Сьвіст і грукат трамваяў, вазоў, самаходаў — бязустанку зьвініць у вушох.

Гаманлівая таўпа сунецца бязмежнаю хваляй, снуе мурашнікам людзей...

І я сярод хвалюючае масы іду, плыву, як човен на моры... Адзін. Ня чуваць тут знаёмага слова, ня радуюць сэрца родныя гукі і вобразы...

Блукаю, як адарваны ад дрэва ліст, гнаны бурай у няведамую даль...

Бязьмежная туга адзіноты прагавітаю п'яўкай смокча з сэрца радасьць і спакой...

У тужлівых вачох палахліва ўстаюць вобразы роднага краю, цені-зьявы сьветлай мінуўшчыны...

Шэрыя палеткі, польныя дарожкі, таёмны пошум хваёвага лесу, плач белых бярозаў...

Восень... Лес шуміць бязьлістым рэшатам галінаў, пласты пачарнелага лісьця засьцілаюць прымерзшую зямлю...

Месяц таёмна-халодным сьвятлом агартае пустыя палі; сухія чароты хмурна ўглядаюцца ў халодныя воды...

Доўгія цені кладуцца на ўзгоркі і лагчыны, зоры баязьлівым дрыжаньнем усеялі далёкае неба...

Жартаўлівыя зайчыкі скачуць па полі, абгрызаючы пасохшы лубін, азімыя пасевы...

. . . .

Таўпа як укапаная замерла на тратуары.

Скрыганулі тормазы, асьляпляючае сьвятло лінула ў вочы...

Хутка мяшаюся з таўпою ды йду далей агорнуты рытмам вялікага места...

Ізноў ліхтары і рэклямы мазоляць мне вочы, а родныя вобразы зьнікаюць у імгле...

Не! Ня зьнікаюць, а хаваюцца на дне душы, каб кожную хвіліну прыпамінаць, што мы жывём ня толькі для сябе! Што на нас чакае Бацькаўшчына, браты!..

І мы прыдзем!

Прыдзем са ўсіх куткоў сьвету на кліч Беларусі!!!

Сьнежань, 1935 г.

ВІК РЭНО

Яшчэ адна...

Ніна і Васіль Крэўскія — брат і сястра. Маладыя, сьвежыя, поўныя сілы, усьміхаюцца гледзячы сабе ў вочы. Усё, што прыпамінае ім аб хуткім растаньні, схавалі дзесь у глыбіні сэрца. Зрэштай, што значыць растаньне? Для блізкіх, верачых у будучыню, яно зьяўляецца толькі паглыбленьнем вялікага жаданьня вечна быць разам, чуць рытм кахаючага сэрца.

Маўчалі. Сонца ўсьмеху схавалася за хмарку. Кожнае ляцела думкамі ў сьвет, гэнь ад свае вёскі. Васіль задумана глядзеў праз вакно, якбы разьвітваючыся з усім блізкім, родным. Ён сяньня ад'яжджае ў Варшаву. Напрацаваўшыся за лета на полі, едзе на зіму да працы над навукаю. Праца была для яго законам жыцьця. Аддаваўся ёй увесь. Ведаў, што поступ жыцьця залежыць ад працы. Студ'яваў вэтэрынарыю. Хутка дабіўся асыстэнтуры. Сваей пэнсыяй даваў падпору сястры і памагаў бацьку. Сам жыў — от, абы пражыць, а быў задаволены навукай Ніны. Атрымліваючы ад яе лісты, хапаў дрыжачымі рукамі і чытаў усёроўна, як білецікі свае любай дзяўчыны. Добры поступ сястры ў навуцы, яе цьвярозы погляд на людзей і жыцьцё, рабілі яму палёгку ў трудных варунках. Зрэштай ня жыў ён сучаснасьцю. Сьветлая будучыня маніла яго вясёлкавымі колерамі лепшага. Прыйдзе час, ён і Ніна здабыўшы самастойнасьць, набраўшы сілы, цьвёрда стануць у першых радах свайго народу, які імкнецца да здабыцьця сваіх правоў.

Поўная веры ў свайго брата, Ніна прымала за свой ідэал яго імкненьні. Вольныя хвіліны школьнага жыцьця праводзіла над студыямі гісторыі свайго народу. Ад сваіх школьных таварышак рожнілася вельмі.

Дзякуючы крытычным адносінам да акружаючых абставінаў, набрала самастойнасьці ў поглядах на кожную рэч. Выдавалася паважнай над свой век. Здабыла гэтым пашану ўсяго вучыцельскага пэрсаналю. Адзін толькі дырэктар ня любіў яе, хаваючы ў душы ціхую ненавісьць. Бачыў у ёй заўсёды вулькан морадасьці, гатовай сваімі парывамі зьнішчыць дашчэнту карьеру ўрадоўца.

Паняцьце палітыкі сярод вучняў агортвала яго неадступным страхам. Здавалася яму часам, што вочы Ніны Крэўскай кідалі іскры адвагі і ахвярнасьці Жанны Д'Арк. Ён, мужчына, чуў страх перад дзяўчынаю-падросткам.

Часам, у хвіліны падрахункаў сваіх дырэктарскіх паступкаў, стараўся зразумець моц кволай на выгляд дзяўчыны. Прыкрываючыся жаданьнем дабрабыту пакрыўджаным, часам мучыўся да крайнасьці, што ня мае тае прастаты, шчырасьці, што сьвеціць з вачэй яго вучаніцы, і прыходзіў да перакананьня, што яна мо-

жа адным словам, адным поглядам зьнішчыць яго дырэктарскую павагу. Ён гэта чуў і баяўся гэтага. Чалавек адкрыў козыр палітыкі.

* * *

Уся сэмінарыя прыгатаўляецца да сьвята 25 сакавіка. Здавалася ўсё ідзець звычайным парадкам: бяз лекцыяў, галасьлівыя пераменкі, гул рэзкага званка, заганяючага моладзь да клясаў, напамінаюць аб галаваломных тэарэмах, каранёх бесканечных ступеняў, пэдагагічных экспэрымэнтах, школе працы Дэвэа, крыжавых паходах, пераживаньнях паэтаў-рамантыкаў і іншых рэчах, запаўняючых жыцьцё вучняў сэмінарыі. Моладзь вучыцца. Вучыцельскія адзнакі сьцьвярджалі сутнасьць гэтае навукі. Пэдагогі, што прыкрываліся бел-чырвона-белым колерам, вывешвалі яго навонак, як шыльд, бегалі, крычалі і мазалі двойкамі рубрыкі вучнёўскіх поступаў. Дарма вучні паклікаліся на недахват часу для прыгатаўленьня лекцыяў. Разумелі іх толькі тыя, што карыстаючы з часу кідалі ў маладыя душы зерне свабоднай будучыні.

Не зважаючы на высокія тоны голасу падшыванцаў, вучні, поўныя пачуцьцяў маестатычнае хвіліны сьвята, цэлымі днямі праседжвалі ў сьценах сэмінарыі: рэпэтыцыі п'есы, сьпеўкі, пробныя дэклямацыі запаўнялі цішыню да позьняе ночы.

Ніна Крэўская, як вучаніца старэйшага курсу, кіравала дэклямацыяй. Адрабіўшы насьпех лекцыі, яна да глыбокае ночы праседжвала над апрацоўкай выбраных вершаў. Модуляваньнем голасу старалася выказаць сутнасьць думак аўтараў. Голасам малявала абразы цьвёрдага змаганьня ў здабыцьці правоў пакрыўджаных, жаданьняў бедных.

Кожнаму дала верш паводле яго спадабаньня і здольнасьці пераказу. Сабе ўзяла „Прарока“ — Я. Купалы. Сагнуўшыся, у сьвятле электрычнае лямпы, вучылася напамяць яго радкі:

Паўстаньце рабскія натуры,
Пакіньце свой адвечны сон...

За вакном завыла сьнежная завея, як-бы хацела заглушыць словы гордае дзяўчыны з іскаркамі моцы і адвагі ў бліскучых вачох.

Слабая целам, волат духам, узьлятала над жыцьцёвымі завеямі штодзенных зьяваў і клікала да сьвету, вольнасьці, свабоды:

Пара у рукі браць паходні,
Уставаць, ісьці ноч рассьвятляць!

Захопліваючыся магутнасьцю слоў паэта, чулася Касандраю згадваючай няясную прышласьць свайго народу. Бачыла, яна жанчына, поўная матчыных пачуцьцяў для пакрыўджаных, шлях сваіх братоў.

І знаю, што было, што будзе,
І вас у крыўду не аддам.

Энэргічным шагам ступіла да вакна. Зрок утапіўся ў цемры ночы. Вецер са страшным выцьцём сыпануў у спацеўшыя

шыбы ледзяным шротам. Здалося, што сярод атаку віхру, пачула дзікі сьмех дырэктара, а цемра блІснула поглядам яго вачэй. Сьмяяўся з таго, што для яе было сьвятасьцю.

Адчуўшы сьмяротную зьнявагу, кінула ўсьлед уроенай мары:

Забылі ўсё, згубілі долю...

Ох, што яна магла зрабіць?... Хацела помсты. Цешылася, што словы „Прарока“ маглі выказаць горкую праўду. Чакала сьвята...

* * *

Генэральная проба. Праграма ўложана самым дырэктарам. Крытычным вокам мерыць кожнае слова, адкідваючы усё, што-б магло задзець высокіх гасьцей урачыстасьці і яго дырэктарскую павагу. Хоча быць удзячным за апеку. Кантралюе асабліва дэклямацыю.

З пробаю выступіла Ніна Крэўская. Баяўся пачуць яе голас. Хацеў забараніць і ня мог. Была волатам слова, правадыром усяго курсу. Не пазволіць дэклямаваць Крэўскаў, значыла паставіць супроць сябе рады ворагаў. Амаль усе вучні і частка вучыцялёў распачнуць атаку. Мусіў згадзіцца.

Сьціснуўшы аберуч галаву, слухаў „злавешчы“ голас Крэўскай.

Калі скончыла, зажадаў выкінуць з верша радкі едкай праўды.

Заціснуўшы зубы адказала:

— Добра.

Не дасьцярог у гэтым слове кіпучае злосьці.

* * *

За цёмнымі кулісамі Ніна чакала свае чаргі. У руках трымае праграмку. Зорка сьлядзіць за яе выкананьнем. Распаленыя вочы міма волі зрываюцца з радкоў друку і імкнуцца кудысьці ў даль. Думкі роем ляцяць пад страху роднае хаты. Бачыць, як у цьмяным куце са стогнам на сьпечаных вуснах борыцца з гарачкаю брат Васіль.

Змогся.

Цяжар нясупыннай вэтэрынарыйнай працы зваліў яго ў пасьцель. Хварэў цяжка. Калі стаў папраўляцца, узяў одпуск і прыехаў дахаты. Цяпер ізноў горай. Сяньня Ніна атрымала ліст.

Пачула, як фундамант, на якім будавала сваю будучыню, трэснуў, а ў грудзёх нешта адарвалася і ўпала ў цемру нейкага бяздоньня. Ня енчыла. Ледаватым поглядам сьмела глядзела ў вочы будучыні.

Прышоўшы ў сэмінарыю, не спаткаўшы дырэктара, забылася пра свой боль. Вочы ненавіснага чалавека крычалі зьнявагай шмат такіх, як яна. Інстынктоўна зьбірала запас спакою. Нашто, — ня ведала. Цяпер на твары мела спакой муміі.

— Крэўская — выходзь! — пачула знаёмы голас, у якім гучэла струнка сумліву. — Памятай, прапусьці — дадаў цьвёрда дырэктар.

Даўшы прыказ, пайшоў і сеў на сваё мейсца першага раду сярод кіпучае пахвалы чужых слоў.

На сцэну выйшла Крэўская. Пабялеўшыя вусны лёгка здрыгнулі. З задніх радоў пасыпаліся воплескі.

- Свае—падумала Ніна.—Зараз будуць слухаць.

Лёгка звонкім голасам пачала сярод цішыні запоўненае салі:

Сярод маны, сярод насьмешкаў...

Тон голасу і блеск вачэй пранікалі ў самае нутро ўважлівых слухачоў.

Горда, падняўшы галаву, пачала кідаць словы, як распаленае зялеза ў твар слухачу першага раду, які неспакойна ўздрыгваў поруч чужых гасьцей. Сьлядзіў кожны ўздрыг мускулаў твару, кожны рух яе рук, тон голасу і пачынаў трыумфаваць.

Крэўская—яго вучаніца—пералівамі тонаў дэклямацыі здабывала славу высокага артызму яго сэмінарыі.

Вось, вось цудоўная ў гэтай позе: паднятая рука, ськіраваная ў яго бок, як-бы паказвае высокага патрона сяньняшняе ўрачыстасьці. На вуснах няўлоўленая ўсьмешка.

А словы, словы бурным руч'ём разьліваюцца па салі. Слухае, хапае, як сьпеў німфы. Мова сьпявае! Ужо узьнімае рукі біць брава.

Што?.. Што чуеш саломены ўладар?!.. Чаму дрыжыш?

Глянь, як сьмела, як цудоўна гаворыць Крэўская! На славу табе, на славу!..

Забылі ўсё, згубілі долю,
Зьмяшалі славы цьвет з гразёй,
І запрадаліся ў няволю,
З душой і скурай шчэзьлі ўсёй...
За мной, за мной!..

— Досыць! — пачулася раптам з першага раду.

Цяжкая заслона ўпала перад Крэўскай і заглушыла словы „Прарока“.

Саля загудзела віхурай...

* * *

Так, гэта было ўчора. Сяньня сапраўднасьць загаварыла прыказам: „Вы, вучаніца IV курсу, з сэмінарыі звольнены“.

* * *

Сонца песьціць сагнутую галаву Ніны Крэўскай. Падняла сумныя вочы. Пабачыла, як даль усьміхалася першым дыханьнем вясны. Вусны ружовыя ад пацалункаў веснавога сонца паўтаралі: „жыць, жыць для ўсіх“...

За вакном шуміць лагодны вецер. Прыслухоўваецца да таёмнага шопату і чуе:

— Яшчэ адна, яшчэ адна...

— Ці апошняя?..

22.XI.33
Вільня.

АД. СТАНКЕВІЧ

Цені й блескі

(Да лёзунгу „Культура нацыянальная формай — камуністычная зьместам“)

Аднэй з многіх асаблівасьцяў прыроды чалавека ёсьць яго нахіл да творства і творчая здольнасьць. Чалавек ніколі ня чуецца здаволены тым, чым абдарае яго прырода, але вечна то заглыбляецца ў гэну прыроду, здабываючы яе тайніцы, то ўзноў заглыбляецца ў собскую псыхіку, сьцьвярджаючы сваю асобнасьць ад акружаючага быту, то ўрэшце вокам сокала выбягае далёка ў прасторы быту паза ўласны духовы сьвет. Вынікам гэтага характару прыроды чалавека і яго бязупыннага даходжаньня правоў і тайніцаў усебыту зьяўляюцца штораз новыя вынаходы - адкрыцьці, штораз новыя спасабы выражзньня—адмаляваньня і быту зьверхняга аб'ектыўнага і быту ўласнага—суб'ектыўнага. Гэтыя рознаякія вынікі творчага нахілу чалавека і яго творчай дзейнасьці завем духовымі вартасьцямі, духовым багацьцем чалавека, культурнымі цэннасьцямі, культурай урэшце.

Культурай такім чынам завецца агульны вынік людзкога творства, прыналежны якой аднэй грамадзкай людзкой групе, у галіне духовай і матар'яльнай.

Даўней культуру ўважалі за адно з цывілізацыяй. Цяпер, праўда, разьдзяляюць іх, але затым, што цалком гэтыя два паняцьці неразьдзельны, часта ўжываюцца яны адно за другое. Аднак два гэтыя сваяцкія паняцьці маюць агулам розны зьмест, рознае значэньне. Культура — паняцьце агульнейшае, цывілізацыя - вузейшае, культура род, цывілізацыя гатунак, бяз культуры ня бывае цывілізацыі. Аб цывілізацыі якой грамадзкай групы гаворыцца тады, калі яе грамадзкі лад вышэйшы ад грамадзкага жыцьця людзкіх групаў прымітыўных. Цывілізацыяй завём агулам усё тое, што адносіцца да бясьпечнасьці ў супольным жыцьці, да матар'яльнага дабрабыту і агулам да нармальных, магчымых людзкіх суадносінаў.

Слова цывілізацыя паходзіць ад лацінскага „civis“—грамадзянін. Знача, у паняцьце цывілізацыі ўваходзіць усё тое, што адносіцца да грамадзкага ўладжаньня людзей: такі ці іншы грамадзка — палітычны лад, гандаль, войска, камунікацыя і г. д. Культура-ж азначае цэласьць спраў і вышэйшых дзеяньняў чалавека, каторыя, будучы вынікам творчай людзкой псыхікі, вядуць чалавецтва да далейшага разьвіцьця і ўдасканаленьня пад узглядам інтэлектуальным, этычным, эстэтычным.

Чалавек звычайна апрача веды мае так-жа веру; там, дзе веда ў яго творчых імкненьнях аказваецца бязсільнай, дапаўняе яе вера, духовае адчуцьцё таго, што ляжыць за межамі фізыч-

нага сьвету, ці як кажуць філёзофы—мэтафізыка. Сталыя ідэовыя, найбольш агульныя, апёртыя на гэтай веры ці мэтафізыцы, адносіны чалавека да ўсебыту называюцца яго ідэолёгіяй, яго сьветапаглядам. Вось-жа культура ня ёсьць нечым суцэльным, усюды аднолькавым, яна мае розны характар залежна ад сьветапагляду тэй грамадзкай групы людзей, ці таго народу, у якім яна паўстае і творыцца. Агулам бяручы, найбольш тыповым сьветапаглядам людзей, ня лічачы пасярэдніх і мяшаных, звычайна бывае або ідэалістычны, або матар'ялістычны. Першы, апрача матэрыі, прызнае на сьвеце сілы духовыя, аж да асабовага Бога (дуалізм), а другі апрача матэрыі на сьвеце ня бача нічога (монізм). Залежна ад такога ці іншага сьветапагляду і культура, твораная людзьмі, агулам гаворачы, носіць на сабе адпячатак сьветапагляду.

Культура бывае матар'яльная і духовая. Першая (матар'яльнае творства, пераважна апёртае на сьціслай навуцы—матэматыцы і інш.—з яе вынікаючых, або да яе зблізканых), будучы найбліжэй зьвязанай з фізычным акружаючым чалавека бытам, больш даступным да яго веды, найменш падатлівая на такі ці іншы людзкі сьветапагляд. Другая-ж (духовае творства, пераважна апёртае на навуках гуманістычных), будучы натурай сваей зьвязанай агулам не з фізычным жыцьцём, але з тым, што як-бы за ім ляжыць, з мэтафізыкай, бадай сусім залежа ад людзкой ідэолёгіі, ад сьветапагляду і іх выразны адпячатак на сабе носіць. Ужываючы далей слова культура, будзем разумець пад ім прадусім культуру духовую.

Культура заходня-эўрапэйская, якая сяньня перажывае крызіс, агулам носіць на сабе адбіцьце ідэолёгіі ідэалістычнай. На ўсходзе Эўропы, у ССРР, даўнейшая, так-жа пераважна ідэалістычная культура, адкінута і збурана, а на яе месца творыцца культура матар'ялістычная, апёртая на філёзофічным скрайна-матар'ялістычным сьветапаглядзе. Характэрыстыкай культурнага творства ў ССРР, датарнаванага там да сучаснага грамадзка-палітычнага рэжыму, зьяўляецца лёзунг: „Культура нацыянальная формай, камуністычная зьместам".

Разгледзім з большага цені і блескі, плюсы і мінусы культуры, творанай пад гэтакім лёзунгам у ССРР прадусім з пункту гледжаньня значэньня яе для беларускага народу.

Лёзунг: „Культура нацыянальная формай — камуністычная зьместам" выражае, як ужо сказана, на падставе матар'ялізму, у соцыяльнай інтэрпрэтацыі Маркса, характар савецкай сучаснай культуры і варункі яе творства.

У ССРР жыве шмат народаў, якія патрабуюць правоў на сваё нацыянальнае жыцьцё. Нацыянальнае-ж жыцьцё кожнага народу многа ў сабе мае элемэнту ідэалістычнага. Вось-жа гэны лёзунг—гэта спроба сынтэзы нацыянальных імкненьняў розных народаў у ССРР і камуністычнага матар'ялістычнага сьветапагляду.

Культура нацыянальная формай, а камуністычная зьметсам — азначае культуру, твораную і выяўляную ў мове кожнага народу і, дзе гэта толькі можна, выражаючую і носячую на сабе філёзофічную ідэолёгію матар'алізму, ці, апёртага на ім, філёзофічна-грамадзкага камунізму. У ССРР, як бачым з гэтага лёзунгу, культуры пастаўлены даволі вузкія рамкі, у якіх кожны народ, праўда, мовай сваей можа карыстацца, але выключна, як правадніком ідэяў матар'ялістычнага камунізму. І сапраўды, сучасная савецкая культура, а ў яе ліку і беларуская, сьцісла ў гэтых рамках і адбываецца, носячы на сабе ідэовы выключна матар'ялістычны характар.

Вось-жа ў культуры, творанай у гэткіх рамках, лёгка дагледзіць недахопы яе і цені, яе крычачую аднабокасьць. Прадусім гэта культура выключае элемэнт нацыянальны, выключае паняцьце народу, як грамадзкай групы, сьведамай сваей асобнай нацыянальнасьці. Аб гэтым сведчыць усё апошніх гадоў беларускае ў БСРР краснае пісьменства, гуманістычныя навукі, школьныя падручнікі і інш. У гэткай культуры кожны народ уважаецца фактычна за этнос, за этнографічную, нацыянальна-неасабовую масу. Тымчасам народ як нацыя, як сьведамая нацыянальна адзінка, — гэта ўжо ня маса, ня этнос, а вырасшая з яго грамадзкая асоба. Калі-ж ідзе аб культурныя вартасьці і творчыя здольнасьці масы і масавай адзінкі — дык ясна, што ў першай яны мінімальныя, прымітыўныя, а ў другой вялізарныя, неаграніčаныя. Тут гэткая самая заходзіць розьніца, як і ў паасобных адзінках: у прымітыўнай, без разьвіцьця асабістай людзкой сьведамасьці, і ў культурнай, з разьвітымі асабістымі індывідуальнымі культурнымі амбіцыямі.

Цень такой анацыянальнай культуры ў тым, што яна ў сваім творчым працэсе, над многімі творчымі вартасьцямі і магчымасьцямі ў народзе, як нацыі, пераходзіць да парадку дзеннага, сама стаючыся анэмічнай і бледнай.

Гэная анэмічнасьць у савецкай культуры, творанай згодна з вузкімі рамамі ведамага нам лёзунгу, кідаецца ў вочы ня толькі дзеля адсунасьці ў ёй нацыянальнага ідэалістычнага элемэнту, але так жа дзеля адсутнасьці ў ёй усякага ідэалізму. Нядаўна ў Маскве паявілася трэцяе выданьне „Избранных стихотворений и поэм“ Лермонтова. Вось-жа рэдактары камуністы павыкідалі з яго ня толькі ўсё тое, што мае рэлігійны характар, але нават вось такое выражэньне: „За злато совесть і закон готов продать охотно он“, у якім гаворыцца аб сумленьні. Гэткага-ж скрайна матар'ялістычнага аднабокага характару ўсё беларускае пісьменства ў БССР. Ясна, што гэткае культурнае творства, як яўна аднабокае, ёсьць убогім, бо пазбаўленае тых шырокіх творчых магчымасьцяў людзкой душы, якія яна мае і да якіх усьцяж імкнецца і ў галіне жыцьця чыста духовага, ідэалістычнага.

Недахоп, цень такой аднабокай, матар'ялістычнай куль-

туры як у Саветах так-жа й у тым, што яна спыняе этычнае разьвіцьцё чалавека, грамадзкіх груп, народу. Гэткая скрайна-матар'ялістычная культура, маючая мэты прадусім практычныя і матар'яльныя, этычнае пачуцьцё зводзіць да грубога ўтылітарызму: тое добрае, што карыснае, і гэтым этычныя асновы прытупляе і спыняе развой іх. Тыя частыя сабатажы, пакражы і розныя надужыцьці ў савецкіх калектыўных гаспадарках, аб якіх пішуць савецкія газэты, так-сама як і ў гаспадарствах капіталістычных, сьведчаць аб тых грозных этычных шчэрбінах кожнай выключна матар'ялістычнай культуры.

Але кожны ідэовы рух, хоцьбы ён быў і дужа аднабокі і памылковы, заўсёды мае ў сабе ня толькі цені, але так-жа, блескі. Гэтыя блескі агулам мае так жа, асабліва тасуючы яе да беларускага народу, і савецкая культура нацыянальная формай, камуністычная зьместам.


Шырокае карыстаньне беларускай мовай — у школе, у навуцы, у ўрадзе, у пісьменстве і агулам у жыцьці грамадзкім хоцьбы нават як сродкам,—мову гэту разьвівае, дасканаліць, багаціць, культывізуе, ня гледзячы нават на набліжэньне апошнім часам яе правапісу з мэтаў палітычных да мовы расейскай. Культура-ж мовы—гэта ўжо вялікая цэннасьць народу.

Постулятам лёзунгу: Культура нацыянальная формай, камуністычная зьместам, зьяўляецца так-жа цывілізацыйны праяў савецкай культуры, хоць не ўва ўсіх этнографічных граніцах, факт існаваньня БСРР, як аўтаномнай адзінкі ў агульным Савецкім Саюзе, бо трудна гаварыць аб карыстаньні мовай народу, не азначыўшы хоць агулам граніц гэтай мовы. Існаваньне-ж БСРР, як палітычнай аўтаномнай адзінкі — гэта пачатак дзяржаўнасьці ўсяго беларускага народу.

Згодна з ведамым нам ідэолёгічным лёзунгам у БССР існуе і разьвіваецца беларуская школа, тэатр, кіно, пісьменства, навука. Многае з гэтага ўсяго, судзячы аб'ектыўна, дзеля сваей ідэолёгічнай выключнасьці, ад'ёмнае, а нават шкоднае для сучаснасьці і будучыні беларускага народу, але так-жа многае, асабліва ў галіне сьціслай навукі і матар'яльнай культуры, сапраўды дадатнае і цэннае.

Знаходзяцца плюсы ў савецкай культуры й цывілізацыі і ў галіне грамадзка-палітычнай. Колектыўная гаспадарка, наскольні яна насупроць капіталізму сапраўды рэалізуе грамадзкую справядлівасьць і дае людзям магчымасьць жыць чэснай працай, а так-жа палітычны саюз народаў, наскольні ён насупроць імпэрыялізму і фашызму сапраўды ёсьць вольным і рэалізуе магчымасьць вольнага сужыцьця народаў, — усё гэта, не гаворачы аб ценях у выкананьні, аб якіх ведама, мае так-жа й блескі ў ідэовых імкненьнях і пачынаньнях.

Словам, праўда і ў яе сьвятле безстаронны крытыцызм—павінны кіраваць адносінамі беларусаў Зах.-Беларусі да культуры ў Беларусі Ўсходняй дзеля дабра беларускага народу як цэласьці.



МІКОЛА НІКІФАРОЎСКІ
(* 1848 — † 1910)

М. ПЯЦЮКЕВІЧ

Мікола Нікіфароўскі — беларускі этнограф

28 траўня 1935 г. (паводле старога стылю) мінула 25 гадоў ад дня сьмерці вялікага этнографа Віцебшчыны — Міколы Нікіфароўскага.

Мікола Нікіфароўскі, як этнограф, плоднасьцяй і якасьцяй працы запісаў сваё імя залатымі літарамі на старонках гісторыі беларускай навукі, а таксама заняў пачэснае месца ў гісторыі этнографіі перадусім усходня-славянскіх народаў.

М. Нікіфароўскі прышоў на сьвет у найцікавейшую пару XIX ст. Ён радзіўся ў траўні 1845 г., а праца яго на ніве навуковай і грамадзкай пачалася іменна ў цікавыя сваімі падзеямі гады мінулага стагодзьдзя. У гэтыя гады адбыўся раптоўны пералом у гісторыі Расеі, які выклікаў гэтым і перапом у сьветапаглядзе народаў, паняволеных царскай Расеяй. Вызвольны рух прымае стыхійныя формы. Наглядаем цэлы рад вялікіх выпадкаў, як нпр. забойства цара Александра II, разгром царкоўнай вуніі, скасаваньне прыгону. Быў гэта так-жа час рашучай барацьбы за Беларусаў.

Польскія паўстаньні і інтэнсыўная палянізацыя зямель б. В. Кн. Літ., рэлігійны прасьлед уніятаў і жорсткая русыфікацыя беларускага селяніна—вось праявы польскай і расейскай барацьбы за беларускія землі.

Палякі „дасьледжваюць“ Беларусь, каб даказаць, што гэта неадлучная частка польскай „ojczyzny“, а маскалі зноў, каб даказаць, што Беларусь—гэта „искони русская земля“. Гэтую „работу“ добра бачыў і разумеў яе значэньне Мікола Нікіфароўскі.

І магчыма, што той зьдзек, які рабіўся над беларускай народнай культурай, быў тым сільным імпульсам для Нікіфароўскага, які папхнуў яго да выкананьня тэй вялікай работы, якую ён зрабіў.

Нікіфароўскі апрацовываў выключна Віцебшчыну, якой першым піонэрам паважнейшых этнографічных досьледаў быў прадусім Шэйн.

Сучасьнік Нікіфароўскага і адначасна ягоны біограф Стукаліч кажа, што Нікіфароўскага да такой неспадзевана вялікай работы ўцягнуў Шэйн. Трэба аднак зазначыць, што Шэйн цалком іншы меў падыход да справы, чым Нікіфароўскі. Шэйн, як ведаем, быў здэцыдаваным русафілам і яго праца, да

некаторай меры, мела служыць гэтым мэтам. Пры тым Шэйн меў ад'ёмнае паняцьце аб беларускай душы, маралі беларуса, яго духовых багацьцях. Шэйн у беларускай масе ня шукаў, бо ня думаў знайсьці, якіхнебудзь духовых цэннасьцяў. Дзеля такога ўпярэджаньня, ён не стараўся пранікнуць глыбей у духовы сьветапагляд беларускіх сялянскіх масаў. Уся яго ўвага была зьвернена на народныя песьні, як філёлёгічны матар'ял, і ў гэтай галіне ён зрабіў шмат. Паміма ўсяго аднак заслуга Шэйна для беларускай этнографіі вялікая.

Цалком іншы характар мае навуковая праца Нікіфароўскага, доўга працаваўшага зусім безінтэрэсоўна пад „фірмай" Шэйна. Ён даваў Шэйну такую масу этнографічнага матар'ялу, што той ня мог нават усяго выкарыстаць у сваіх выданьнях і аддаваў гэтыя матар'ялы ў архіў Акадэміі Навук.

Некаторыя сучасьнікі Нікіфароўскага і Шэйна кажуць так: „каб ня было Нікіфароўскага, то ня было-б і Шэйна, як этнографа". Ці гэтае дапушчэньне праўдзівае, сяньня яшчэ трудна сьцьвердзіць, адно толькі ведама, што Нікіфароўскі доўга пад фірмай Шэйна працаваў, ня думаючы аб сваей славе, а мроіў толькі аб тым, каб тое, што ён сабраў з роднай Беларусі, убачыла сьвет праз друкаванае слова.

Нікіфароўскі па сваім навуковым шляху ішоў, як кожны чалавек надзвычайных здольнасьцяў і інтэнсыўнай працы, самастойна. Досьледы над народным бытам для Нікіфароўскага ня былі жаданьнем назьбіраньня як найбольшай колькасьці матар'ялу для жрацоў навукі. Праца яго ня была плодам халодных абсэрвацыяў. Не. Сам, будучы па тагдышняму сьвядомым беларусам, імкнуўся заглянуць у душу свайго роднага селяніна. З любоўю дасьледжваў нават самыя дробныя рысы яго вонкавага быту і духовыя праявы народнага розуму і характару.

На пачатак 90-х гадоў мінулага веку прыпадае пара цалком самастойнай навуковай працы Нікіфароўскага. Ён пасылае свае працы дзеля перагляду і ацэны навуковым установам, якія ўрэшце пачынае друкаваць часткова на старонках „Витебскіхъ Губернскіхъ Вѣдомостей", частова ў спэцыяльных этнографічных органах, пасьля выдае гэтыя пруцы ў форме адбітак і асобных абшырных выданьняў.

Дзеля таго, што ў тую пару навуковая і літаратурная дзейнасьць вучыцялёў няпрыхільна была сустраканая ў вышэйшых школьных уладаў, дык адкрытае выступленьне на гэтым вучастку Нікіфароўскага было спаткана выразна несымпатычна. Гэтакае выступленьне Нікіфароўскага ня толькі не давала яму якуюколечы матар'яльную карысьць, але наражала яго на рознага роду няпрыемнасьці, як з боку школьных уладаў, так і калегаў. Гэтакі чын Нікіфароўскага сучасныя ягоныя прыхільнікі называлі вялікай цывільнай адвагай, а нават гэраізмам свайго роду.

Падсумаваўшы доўгалетнюю інтэнсыўную працу нязморана-

га працаўніка на ніве беларускай навукі, будзем мець такі багаж:

Нядрукаваныя працы Нікіфароўскага:

Нікіфароўскі Н. Я., [Успаміны аб даўгалетняй працы ў Віцебскай гімназіі. 6 сшыткоў—рукапісы]. (Перад смерцяй спаліў). — **Никифоровскій Н. Я.**, На память моимъ дѣтямъ (аутобіографічны матар'ял). — **Никифоровскій Н. Я.**, Записки архіерейского пѣвчего.

Рэцэнзіі і зацемкі аб працах Нікіфароўскага:

Бочковъ Д., Бѣлорусскія пѣсни „Частушки", собранныя Н. Я. Никифоровскимъ. Записки Сѣверо-Западного Отдѣла Имп. Русского Географ. Общества. Вильна 1912, кн. 3, стр. 359—360. — **Езавітаў К.**, Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі. Ластаўка. Зборнік вучнёўскіх твораў Дзярж. Люцынскай Беларуск. Гімназіі ў Латвіі. Люцын, 1924, стар. 2. — **Карскій Е. Ф.**, Новые труды по бѣлорусской этнографіі за 1895 г. [Никифоровского, Довнар-Запольского и А. Чернаго. Рэцэнзія]. Журналъ Министерства Народн. Просвѣщенія. СПБ. 1896. V, стр. 153—163. — **Е[вфимій] К[арскій]**, Бѣлорусскія пѣсні „Частушки", собранныя Н. Я. Никифоровскимъ. Вільна 1911. Варшава 1912. „Русскій Філологич. Вѣстник" № 1—2, стр. 434—435. — **Нікіфароўскі М.**, Духоўныя песьні [1]. Старцы. Вільня 1917 „Гоман" № 70, 71. — **Нікіфароўскі М.**, Напоўпрыслаўкі, напоўпрыказкі. Коўна, 1924. „Крывіч" № 1(7), бач. 13—23. — **Стукаличъ В.**, Страничка изъ недавней старины города Витебска. „Витебскія Губернскія Вѣдомости". 1895. № 231 232. (Матеріялы о дѣятельности Шейна и Никифоровского). — **Стукаличъ В. К.**, Н. Я. Никифоровскій. 1845—1910 года. Вильна. Изд. Сѣв.-Зап. Отд. Имп. Русск. Географ. Об-ва. 8⁰. 2+32+1 порт.

Бібліографія прац Нікіфароўскага:

Никифоровскій Н. Я., Очерки Витебской Бѣлоруссіи. I. Старцы. Москва 1892. „Этнограф. Обозр." № 1, стр. 70—105. — **Никифоровскій Н. Я.**, Очерки Витебск. Бѣлоруссіи. II. Дударъ и музыка. Москва 1892. „Этнограф. Обозр." № 2—3, стр. 170—202.— **Никифоровскій Н. Я.**. Пособники жихара. „Этнограф. Обозр." кн. XVII. Москва 1893. Стр. 56. — **Никифоровскій Н. Я.**, Сельско-школьное обученіе въ юговосточной окраинѣ Витебской Бѣлоруссіи до 19 февраля 1861 г. Витебскъ 1893, або: „Витебскія Губ. Вѣдомости" № 67, 68, 71, 72, 73, 74, 75 і 76 за 1893 г. — **Никифоровскій Н. Я.**, Подданые пособники. „Этнограф. Обозр." кн. XX. Москва 1894. Стр. 29—88. — **Никифоровскій Н. Я.**, Очерки простонародного жытья-бытья въ Витебской Бѣлоруссіи і описаніе предметовъ обиходности. Витебскъ 1895. Стр. VIII+552+CLII.

— **Никифоровскій Н. Я.**. Питушчіе и пропойцы. „Етногр. Обозр.“ кн. XXXI. Москва 1896. Стр. 25. — **Никифоровскій Н. Я.**, Очерки Витебской Бѣлоруссіи. VI. Игры и игроки. „Этногр. Обозр.“ кн. XXII. № 3. Стр. 21—66. Москва 1897. — **Никифоровскій Н. Я.**, Простонародныя примѣты и повѣрія, суевѣрные обряды и обычаи, легендарныя сказанія о лицахъ и мѣстахъ въ Витебской Бѣлоруссіи. Витебскъ 1897. Стр. X+307+XXX.—**Никифоровскій Н. Я.**, Гончарныя терракоты Витебска по археологическимъ находкамъ. Витебскъ 1897. „Витебск. Губ. Вѣдомости“ № 135, 136, 137, 138 за 1897 г. — **Никифоровскій Н. Я.**, Бабы або жонки. „Этногр. Обозр.“ кн. XXXIV. Москва 1898. Стр. 36. — **Никифоровскій Н. Я.**, На почвѣ простоты вѣры. „Вит. Губ. Вѣдомости“ въ № 11, 12 за 1898 г. Витебскъ 1898. Стр. 1—12. — **Никифоровскій Н. Я.**, Матеріялы для народного снотолкованія. „Этногр. Обозр.“. Москва 1898. № 1. Стр. 133—139. — **Н[икифоровскій] Н. Я.**, Ляцкій Е. Матеріялы для изученія творчества и быта бѣлоруссовъ I. (Рецэнзія). „Витебскія Губ. Вѣдом.“ 1898. № 88. — **Никифоровскій** Н. Я., Простонародныя загадкі, собр. въ Витебской губерніи. Памятная Книга Витебск. Губ. за 1898. Стр. 309—343. Витебскъ 1898. (Асобн. адб. бач. 1—33). — **Никифоровскій** Н. Я., Никольская церковъ въ м. Бѣшенковичы. Витебскъ 1899. Стр. 20. — **Никифоровскій** Н. Я., Сбяги, прочки, вонки, уходолы. „Этногр. Обозр.“. Москва 1899. № 1—2. Стр. 1—18. — **Никифоровскій** Н. Я., Страничка изъ недавней старины гор. Витебска. Витебскія Губ. Вѣдомости за 1899 г. Витебскъ 1899. (Асобн. адб. стр. 250).—Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Громничныя свѣчи. Витебскъ 1903. „Полоцкія Епархіяльныя Вѣдомости“. Отд. неофиц. № 15, стр. 366—377. — Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Іорданская освяшченная вода. Витебскъ 1903. „Полоцкія Епархіяльныя Вѣдомости“. Отд. неофиц. № 15, стр. 566—569; № 16, стр. 605—607. — Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Освяшченная верба. Витебскъ 1903. „Полоцк. Епарх. Вѣдомости“. № 18, ч. неофиц., стр. 675—678. — Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Освяшченные предмѣты для разового употребленія. Витебскъ 1903. „Полоцк. Епарх. Вѣдом.“ № 22, ч. неофиц., стр. 821—824. — Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Освяшченные травы и цвѣты. Витебскъ 1903. „Полоцк. Епарх. Вѣдом.“ № 20, ч. неофиц., стр. 755—746. — Н. Н. [**Никифоровскій** Н. Я.], Освяшченные хлѣбы. Витебскъ 1903. „Полоцк. Епарх. Вѣдом.“ № 20, стр. 756—759. — **Никифоровскій** Н. Я. Освяшченные предмѣты і отношеніе къ нимъ простонародія Витебской Бѣлоруссіи. Витебскъ 1903. „Полоцк. Еп. Вѣд.“ № 10—20 і 22 за 1903 г., стр. 1—26 адб. — **Никифоровскій** Н. Я., Нечистики. Сводъ простанародныхъ въ Витебск. Бѣлоруссіи сказаній о нечистой силѣ. Вильна 1907. „Віленскій Вѣстникъ“. Т. II. 1907. Стр. 1—105. — **Никифоровскій** Н. Я., Нолупословицы и полупоговорки, употребительные въ Витебской Бѣлоруссіи. Вильна 1910—1912. Записки Сѣверо-Заподного Отдѣла Имп. Русск. Географ. Об-ва. 1910. № 1, стр. 197—207; 1911. № 2, стр. 142—154; 1912. № 3, стр. 300—303. — **Никифо-**

ровскій Н. Я., Бѣлорусскія пѣсни „Частушки“, собранныя Н. Я Никифоровским... подъ ред. и съ предислов. А. Ф. Занкевича. Вильна. 1911. Стр. IV+166.

Апрача гэтых працаў, якія вышлі друкам, былі яшчэ іншыя, якія асталіся ў рукапісах.

Як інфармавала біографа Стукаліча жонка Нікіфароўскага, былі Нікіфароўскім напісаныя ўспаміны аб даўгалетняй пэдагагічнай працы ў Віцебскай мужчынскай гімназіі. Гэтыя ўспаміны абымалі шэсьць сшыткоў, але ў апошнія дні свайго жыцьця аўтар іх чамусьці спаліў.

Прыведзены толькі што пералік працаў Нікіфароўскага даказывае нам, як глыбока ён разумеў сваю задачу, а ўдачнае выкананьне свайго пляну даказывае, якой сільнай валадаў ён воляй.

Нікіфароўскі паставіў сабе за заданьне выканаць у галіне беларускай этнографіі тое, чаго не зрабілі, або не дарабілі ягоныя папярэднікі, або сучасьнікі. Не зрабілі таго ані Шэйн, ані Раманаў, што зрабіў Нікіфароўскі.

Вышаўшы на самастойны шлях дасьледавальнай працы, згуртоўвае сваю ўвагу і выняткова быструю спасьцярожлівасьць галоўным чынам на апісаньне існуючых яшчэ нядаўна, а паволі зьнікаючых тады асаблівасьцяў сямейнага і грамадзкага жыцьця, звычаяў, абычаяў і вераваньняў віцебскага беларуса.

Свае спасьцярогі і запісы Нікіфароўскі згрупаваў і пасэгрэгаваў паводле глыбока абдуманай мэтоды, маючы на ўвазе заўсёды тое, што найменшыя дробезі, сабраныя ўмела і ўпарадкаваныя, маюць сваю вартасьць для навуковых мэтаў. І дзеля гэтага этнограф наш заўсёды стараўся даць памагчымасьці поўны і наглядны малюнак тых бытавых зьяваў народнага жыцьця Віцебскай Беларусі, якія ягонымі папярэднікамі ня былі ўзяты пад увагу. Нікіфароўскі дасьледваў сялянскае жыцьцё ўва ўсей яго паўнаце, як напр.: способы прыгатаваньня яды, мужчынская і жаночая вопратка, способы выпрабляньня вопраткі (ткацтва), дамашнія і палявыя, мужчынскія і жаночыя заняткі і ўжываныя пры гэтай працы гаспадарскія прылады, способы паляўніцтва і рыбалоўства, адбіцьцё ў народным быце прыгону і способы адбываньня адработкаў, панскія слугі і прыганятыя, іх адносіны да падданых, быт і доля наемных работнікаў, характар сямейнага і жанімскага жыцьця, прадметы рэлігійнага культу, будаўніцтва вясковых сьвятыняў, народн. музыка і народныя гульні, прыметы і забабоны, якія глыбока закараніўшыся аж да сяньняшніх часоў і якія спадарожнічаюць селяніну ад калыскі аж да магілы; выабражэньні народу аб нячыстай сіле і цэлы рад іншых праяваў жыцьця нутранога і вонкавага беларускага селяніна ахопліваюць вельмі падрабязна працы Нікіфароўскага. Гэты багаж Нікіфароўскага сьведчыць аб надзвычайна быстрай і праніклівай спасьцярожлівасьці аўтара і аб вялікай адданасьці і любові свайму роднаму беларусу і сваей навуцы.

Можна сьмела сказаць, што ў працах Нікіфароўскага ёсьць усе неабходныя матар'ялы для напісаньня поўнай этнографічнай манаграфіі Беларусі. У гэтых працах улоўлены найдрабнейшыя мамэнты і адцені беларускага народнага быту. Для філёлёгічных мэтаў гэтыя матар'ялы таксама маюць значэньне, але меншае, бо яны незаўсёды запісываны паводле вымогаў філёлёгічных.

Цяпер спынімся крыху над кароткім зьместам некаторых паважнейшых працаў Нікіфароўскага. Капітальнай яго працай зьяўляецца: „Очеркъ простонароднаго житія-бытія въ Вітебской Бѣлоруссіи". У гэтай працы пададзены поўны бытавы малюнак хатняга жыцьця беларускага селяніна. Аўтар за селянінам ходзіць крок у крок, сьледзіць за яго штодзенным і сьвяточным жыцьцём пільным, любячым шчыра і дабрадушным вокам блізкага душой чалавека. Тут ёсьць і соцыяльны пагляд аўтара, нпр. у 10-тым разьдзеле гэтай працы Нікіфароўскі наракае на цяжкое палажэньне беларускага селяніна, якога прырода абдарыла багацьцем душы, аднак селянін, замест добрага хлеба, есьць „мякінку".

Амаль адначасна з успомненай працай друкаваліся ў „Етнографическом Обозрѣніи" і вышлі ў сьвет асобнымі адбіткамі і выданьнямі пад агульным загалоўкам „Очерки Витебской Бѣлоруссіи". Гэта вельмі зьмястоўнае апісаньне розных бакоў жывога народнага быту. Заслугоўвае тут на спэцыяльную ўвагу разьдз. IV п. з. „Подданые пособники", пад якімі трэба разумець прыгонных падданых. Аўтар паставіў сваей задачай даць праўдзівы малюнак жыцьця прыгоннага сялянства. І гэты вобраз Нікіфароўскі адмаляваў вельмі яркімі і поўнымі фарбамі.

У цеснай лучнасьці з „Очерками Витебской Бѣлоруссіи" і асабліва з „Очеркамі простонароднаго житія-бытія въ Витебской Бѣлоруссіи" знаходзіцца капітальная праца М. Нікіфароўскага п. з. „Простонародные примѣты і повѣрья".

Гэтая праца зьмяшчае ў сабе багатыя і цэнныя этнографічныя матар'ялы. У гэтай кнізе зьмешчана больш дзьвёх тысячаў народных прыметаў, забабонаў, абрадаў і абычаяў. Каб зарыентавацца ў багацтве і вартасьці гэтай кнігі, прыточым тут яе зьмест: —Дзіця ад пачатку да канца блазноцтва.—Будзённае жыцьцё дома і за домам.—Сьвет зьвярынны, падзямельны і зьявы прыроды. —Сьвяточнае жыцьцё дома і задомам.—К вечару—нярана (хворы, старасьць, розныя недамаганьні і сьмерць).—Дадатковыя легенды.

Нікіфароўскі працаваў ня толькі ў галіне беларускай етнографіі—яго шырокі розум займалі і іншыя пытаньні беларускага жыцьця. Апрача чыста навуковай працы—ён займаўся адначасна і грамадзкім пытаньнем, як пр. школьнае пытаньне на Беларусі. Гэтаму пытаньню ён пасьвяціў паважную працу п. з.: „Сельско-школьное обученіе въ юго-восточной окраинѣ Витебской Бѣлоруссіи".

Не павінна абмінуць нашу ўвагу яго праца, якая здавалася-б неэтнографічнай, а якая аднак мае гэтакі характар з увагі на зьмяшчэньне звычаяў шырокіх слаёў гор. Віцебска. Праца

гэта называецца: „Странички изъ недавной старины Гор. Витебска“. Стары беларускі Віцебск, закладзіны якога гісторыкі адносяць да першых вякоў нашай гісторыі, шмат бачыў цікавага. Здаўна быў выдатным цэнтрам інтэлектуальнага і эканамічнага жыцьця насельніцтва басэйна р. Дзьвіны. Дзеля гэтага Віцебск багаты і гістарычнымі памятнікамі і агулам сваімі спэцыфічнымі асаблівасьцямі. І гэта пабудзіла Нікіфароўскага да напісаньня адпаведнай працы аб сваім любімым Віцебску. У гэтай працы Нікіфароўскі, хоць мімаходам, дае даволі дакладнае апісаньне Замкавай Гары, Сабораў Мікалаеўскага і Усьпенскага, гарадзкіх вуліцаў у старым выглядзе, а таксама і жыцьцё духовае гараджан. Успомніўшы мноства ў Віцебску рынкавых плошчаў, аўтар спыняецца на апісаньні кірмашнага жыцьця, якое мела свае характэрныя асаблівасьці.

Таксама падрабязна аўтар апісывае грамадзкае і тварыскае жыцьцё ўсіх слаёў гораду: розныя гульні, імпрэзы і т. п Агулам Нікіфароўскі знаў ня толькі селяніна, але ня менш знаў і жыхарства гор. Віцебска. І таму гэта праца Нікіфароўскага мае і таксама як і вышэй успомненыя, вялікае значэньне для гісторы, гарадзкіх звычаяў.

* * *

Аб духовым вобліку Нікіфароўскага можам гаварыць толькі на падставе інфармацыяў ягоных сучасьнікаў, да якіх належыць біограф Стукаліч. Ён так кажа аб Нікіфароўскім: „Страта так яшче сьвежая, што перад нашымі духовымі вачыма Ён стаіць як жывы, спакойны, задумлівы, з прыветлівым паглядам і мілай усьмешкай на вуснах. Ён заўсёды ўнікаў спрэчак і нязгоды, ня зьбліжаўся з тымі адзінкамі, якія не адпавядалі ягонаму нутру, ягонай душы. Жыцьцё не давала яму роскашы, але ён і ня жаліўся ніколі і нікому на сваю долю. Усе прыкрасьці ціха хаваў у сваім добрым сэрцы. Ён не жадаў славы ані пахвалаў. Да людзей адносіўся мякка, дабрадушна, хоць рабілі яму амаль на кожным кроку прыкрасьці. У ягоныя часы існаваў такі пагляд, што рыбак павінен займацца толькі рыбалоўствам, а вучыцель папраўляньнем сшыткоў, а не займацца навукай, да якой маюць права толькі прафэсары, акадэмікі, якія на гэта празначаныя начальствам.

Калі бывала калегі Нікіфароўскага выказвалі такія погляды, то ён спакойна ўсьміхаючыся казаў: „гісторыя скажа з часам сваё слова, хто з нас даў большую карысьць грамадзянству.

Навука, грамадзянства, народ, агульнае дабро — вось гэта былі жыцьцёвыя лёзунгі Нікіфароўскага. Свае інтарэсы ён умеў заўсёды падпарадкаваць народным, грамадзкім інтарэсам. Лічучы сябе больш карысным на сваім баявым становішчы на Беларусі

ён зрокся магчымасьцяў лепш матар'яльна ўладзіцца дзенебудзь далей ад Бацькаўшчыны". *)

Далей аб Нікіфароўскім, як аб чалавеку выняткова вялікіх вартасьцяў духовых, кажа Стукаліч так:

„Чалавек такіх рэдкіх здольнасьцяў, такога шырокага духовага кругазору, такой саліднай навуковай падрыхтоўкі, такой вялікай любасьці да працы, такіх талентаў і такіх высокіх маральных вартасьцяў, пражыўшы свой доўгі век у Віцебшчыне і пасьвяціўшы ей усе свае сілы, мусіў быць акружаны агульнай увагай, пашанай, маральным і матар'яльным падтрыманьнем, аднак гэтага Ён ня меў".

Выняткова безінтэрэсоўнасьць Нікіфароўскага, яго безгранічная адданасьць роднаму народу і навуцы, яго незалежны характар і спосаб думаньня,—усе гэтыя прыгожыя якасьці розуму і сэрца былі пасьвячаны вялікай справе, а як найменш асабістым інтарэсам.

* * *

Нікіфароўскі быў вялікім і шчырым беларускім патрыётам гэных часоў, у якіх ён жыў і працаваў. Гэты патрыятызм праходзіць праз усе яго працы чырвонай ніткай. Іменна яго патрыятычнае пачуцьцё дадавала Яму ахвоты і энэргіі да так вялікай і несьмяротнай працы, якую ён зрабіў для Беларусі.

Ён з пылу мінуўшчыны адкопываў характэрныя рыскі беларускай народнай душы. Ён сваімі працамі хацеў паказаць праўдзівае і чыстае аблічча беларускага народу, яго культуры, яго нацыянальных прыметаў. І міма ўсялякіх прыкрасьцяў і перашкодаў ён сумленна і ў цэлай паўнаце выканаў сваё заданьне.

Ужо ў апошніх гадах свайго працавітага жыцьця Нікіфароўскі цешыўся з сваей працы, бо ён пабачыў яе вялікую навуковую вартасьць. Урэшце пабачыў, як справа дасьледаваньня роднай Беларусі шыбкімі шагамі пайшла наперад і як урэшце ягонымі працамі зацікавіўся навуковы сьвет,—як існаваўшая дасюль пагарда да беларускага народу або непрызнаваньня ягонай народнай культуры, як апрычонага народу, пачала зьменівацца на лепшае. Яшчэ за яго жыцьця распачаліся навуковыя досьледы над беларускім языком, гісторыяй, архэолёгіяй, этнографіяй і т. д. Ён пабачыў працаўнікоў на ніве беларускай навукі: Сабалеўскага, Шахматава, Карскага, Доўнар-Запольскага, Раманава і цэлы рад іншых. З гэтай работы Нікіфароўскі сардэчна цешыўся. У гэтым ён ужо пабачыў задаткі, якія ўмацавалі ў ім веру ў сьветлую будучыню і сілу творчую ягонага народу.

---

*) Усе цытаты, паданыя ў чужасловах, выбраны з артыкулу: Стукаличъ В. К., Н. Я. Никифоровскій — 1845—1910. Вильна 1910. Изд. Сѣв.-Зап. Отд. Имп. Русск. Географ. Об-ва.—Ў. П.

„Ня зьелі нас раней—ўспакаівају Нікіфароўскі пэсымістаў,— а цяпер і тымбольш не зьядуць, калі мы дакрануліся зямлі-маткі“.

* * *

Жыцьцё Нікіфароўскага, як кажа Стукаліч, „убогае вонкавымі праявамі, затое багатае нутраным зьместам, вечнай працай розуму і пачуцьця. У вясковай цішыні нарадзіўся, дасьпеў і акрэп ягоны талент, ня гледзячы на шматлікія няспрыяючыя ўмовы, якія яго акружалі“. Нікіфароўскі радзіўся ў вёсцы Вымна, Суражскага пав., Віцебскай губ. Вырастаў і выхоўваўся ў сям'і вельмі бедных бацькоў духоўнага званьня, якія займаліся земляробствам і з гэтага пераважна пражывалі. Мікола пачатковую адукацыю атрымаў у пачаткавых расейскіх школах. У 1855 г. бацька завёз яго ў Віцебск і аддаў у архірэйскі хор. Мікола будучы сьпеваком архірэйскага хору адначасна вучыўся ў духоўнай школе. У архірэйскім хоры ён прабыў 6 гадоў і аб гэтым прабываньні напісаў свае ўспаміны п. з. „Очеркъ жизни певчихъ Витебскаго архіерейскаго хора съ 1-го сентября 1855 по 1-е сентября 1861 г.“. Успаміны гэтыя вельмі цікавыя з увагі на матар'ял біографічны аўтара.

Па сканчэньні духоўнай школы Нікіфароўскі выйшаў з хору і паступіў у Полацкую Духоўную Сэмінарыю, якую кончыў у 1867 г. Матар'яльныя абставіны не далі магчымасьці далей вучыцца і ён мусіў уступіць на шлях пэдагагічнай працы. І так з 4.X.1867 г. да 13.IX.1871 г. быў вучыцелем рэлігіі і пасьля агулам вучыцелем на вёсцы. У 1871 г. дастае працу вучыцеля ў прыхадзкой школе ў Віцебску. З 1877 г.—у прыгатаваўчай клясе Сьвіслацкай Вучыцельскай Сэмінарыі. У гэтым-жа годзе (1877) здаў экзамін на вучыцеля павятовай школы і дастаў пасаду ў мужчынскай Віцебскай Гімназіі. З 1900 г. да 1902 г. вучыць у Маладэчанскай Вучыцельскай Сэмінарыі, пасьля зноў на ўласную просьбу пераносіцца ў родны Віцебск на становішча вучыцеля гімназіі. З усей 43 гадовай працы Нікіфароўскі пасьвяціў Віцебску 33 гады

Гэтулькі пакульшто можам сказаць аб Нікіфароўскім, які ў гісторыі беларускай навукі займае дасюль перадавое месца з увагі на колькасьць і якасьць сваей этнографічнай працы.

УЛ. ТАЛОЧКА

Да справы нацыянальнасьці прафэсара М. Баброўскага

У выніку ўкладу сілаў, які пакінуў на Беларусі XVIII век, і не бяз уплыву клічаў Вялікай Францускай Рэвалюцыі, бачым у нас на пач. XIX в. барацьбу між уніятамі манахамі Базыліянамі—польскай партыяй—і ўніяцкім сьвецкім духавенствам—партыяй „рускай“, гэта знача „паповічаў“*) і „мужыкоў“. Існаваньне гэтага зьявішча сьцьвярджае Язэп Белінскі ў сваей, дагэтуль не перастарэлай, працы „Uniwersytet Wileński“ (III, 10), аднак ацэна паданага ім факту вымагае свайго роду аналізы, дапаўненьня і выясьненьня. Прадусім барацьба гэтых двух партыяў ані троха ня была ціхай, бо водгалас яе чулі ўсе, што мелі вушы. Быў гэта водгалас надходзячай буры, што змушала разважнейшых у пару надумацца, як ад буры забясьпечыцца.

Партыю „паповічаў“ і „мужыкоў“ Белінскі прабуе называць расейскай. Пэўна, маглі быць і хіба былі сапраўды адзінкі ці групы, што ар'ентаваліся на Расею. Ды й дзівіцца з гэтага няма чаго, памятуючы, што было тады пакаленьне, якое яшчэ ўласнымі вачыма глядзела на няслаўны канец шляхоцкай быўшай Рэчыпаспалітай. Акрываўлены тады і маючы ўжо параненыя крыльлі, польскі Белы Арол, каторы патрабаваў блізу паўвеку, каб узьняцца нанова да лёту, ня мог, ясная рэч, гарантаваць якойнебудзь апекі беларускаму уніяцкаму насельніцтву. Такім чынам да слабейшых і склонных да сэрвілізму душаў лёгка маглі дастацца сумнівы, выплываючыя з іх заламаньні і нават масавыя адступствы, прыпячатаныя ўрэшце чынам.

Калі тагачасныя Базыліяне на Беларусі праводзілі (сьведама ці нясьведама—у гэта ня ўходзім) праз свае школы й цэрквы ў шырокім разьмеры полёнізацыйную работу, сьвецкае духавенства бачыла гэта й пачувалася да абавязку распачаць працу іменна дзеля абароны захаваньня беларускай душы меснага ўніяцкага насельніцтва і, што з гэтага ішло і звычайна йдзе ў пары, самабытнасьці ўсходняга абраду, для каторага „братні“ лацінскі меў толькі няшчырую і прымусовую—праз увагу на далёкі Рым—толеранцыю. Трэба было нешта рабіць. Ніколі ня было так праўдзівым, як тады, лацінскае прыслоўе: periculum in mora—небясьпека ў маруднасьці.

Сярод тагачаснага ўніяцкага духавенства быў малады, дужа здольны і поўны энэргіі вучоны прафэсар Міхал Баброўскі. Паміма таго, што так-жа „паповіч“ з роду і „мужык“ з пачуцьця, належыў ён некаторы час у моладасьці да Філярэтаў, сярод

*) Паповіч—сын уніяцкага сьвяшчэньніка.

якіх між іншым былі свайго роду сымпатыкі і беларускага народу. Такая ўжо была тады мода, што больш паступовы й асьвечаны элемэнт у быўшым Віленскім Унівэрсытэце, запісваўся да тэй арганізацыі, каторая была тады найлепшай рэкамэндацыяй для кожнага, хто меў намер заняць якоенебудзь значнейшае грамадзкае становішча і адыграць у грамадзянстве паважнейшую роль, што так было натуральным у жыцьці маладога і таленавітага М. Баброўскага, паходзячага з старой, але абяднелай, беларускай (украінскай) шляхты на Падлесьсі, у Бельскім пав. Горадзеншчыны. Аткрыў ён сабе гэтым дзьверы да прыгожай у будучыні грамадзкай кар'еры.

Ня будзем тут спрачацца ані выключаць магчымасьці, што ў гэтым раньнім пэрыодзе яго дзейнасьці, М. Баброўскаму магло здавацца, што ён ужо ёсьць прыродным паляком. Ды бадай мала тады, на мой пагляд, розьніўся такі беларускі ці ўкраінскі „Паляк" ад тагочаснага Беларуса ці Украінца інтэлігэнта, бо быў заўсёды, да сьмерці Паляком паводле прысвоенай сабе культуры.

Трэба тут дадаць, што паняцьце культуры агулам на пач. XIX в. ня было так зложаным, заборчым і даглыбінным, як сяньня, калі культура і нацыя ў практыцы значыць ужо часта адно й тое самае. Паняцьці гэтыя не пакрываюцца толькі тады, калі далучаецца мамэнт расы, як напр. у Жыдоў, Нэграў, Індусаў і інш. За часаў аднак філярэцкіх у склад паняцьця культуры, асабліва польскай, уваходзіла ня так шмат складовых дзейнікаў і яна нямнога мела вымогаў. Можна было тады лёгка быць Паляком паводле культуры, ані троха не выракаючыся беларускасьці, літоўскасьці, украінскасьці... Сяньня працэс дыфэрэнцыяцыі пад гэтым узглядам дужа многа паступіў наперад і толькі вынятковыя адзінкі—пры тым надта рэдка—могуць у душы сваей захаваць гэткае equilibrium. Магчыма, што гэтага трымаўся ў сваей маладасьці і М. Баброўскі.

Лёс жыцьця памагаў яму зайсёды, каб знашоў сябе ў поўні. Іншая рэч, ці гэныя магчымасьці ён выкарыстаў. Вось у 1817 г. рада Віленскага Унівэрсытэту высылае М. Б. заграніцу, паручаючы яму, каб падчас заграцічнай падарожы зазнаёміўся з славянскімі мовамі (там-жа, 127). Прыгожая гэта была падарожа, калі трывала цэлых пяць гадоў (1817—1822). Зачаў яе М Б. ад таго, што ў слаўнай царскай бібліотэцы ў Вене і ў багатай бібліотэцы гр. Оссолінскіх у Львове студыяваў славянскія рукапісы. Пасьля адведвае—пачынаючы ўжо фэрмэнтаваць нацыянальна—Чэхію, Моравію, Славакію, Краіну, Харвацыю, Славэнію, працуючы чародна ў Празе, Вэлеградзе, Любляне, Рагузе, у Дуброўніку, у Задры... Маючы рэкомэндацыйныя лісты ад Б. Конітора з Вены да чэскіх вучоных зьбліжаецца наш малады навуковы дасьледнік у Празе з Яз. Доброўскім, В. Ганкай, Юнгманам, Цыммэрманам і з інш. У паложанай на даўнейшых славянскіх землях Вэнэцыі часта спатыкаецца з П. Солярычам, а ў Дуброў-

ніку з літаратам Мюсічам, ад якіх нямала карыстае. Ня чужы прытым ёсьць М. Б. і палітыцы, калі бярэ ўдзел у зьезьдзе Славян у кастрычніку 1820 г. у Задры, (там-жа, 128).

Праз славянскія землі, папаўшы ўрэшце ў Рым, бярэцца М. Б. ў Ватыканскай бібліотэцы да апрацаваньня для сваіх далейшых студыяў каталёгу найбольш старадаўных славянскіх рукапісаў і друкаў, далучаючы да яго *facsimilia* важнейшых і перапісваючы некаторыя цалком. Знойдзены тут ім дужа старадаўны рукапіс харвацкі. Гэты каталёг рукапісаў слаўны ватыканскі бібліотэкар Анджэлё Маі выдаў друкам у Рыме ў 1830 г. у: „*Nova Collectio Veterum Patrum*" V т. Працуючы тут М. Б. знаходзіцца ў корэспондэнцыйных зносінах з чэскімі вучонымі ў Празе. Урэшце канчае пяцігодняе прабываньне сваё заграніцай адведзінамі ў 1822 г. найменшага з славянскіх народаў Лужычан і тут у Будзішыне адбывае яшчэ студыі этнографічныя і філёлёгічныя над іх фолькляром і пісьменствам. Дапамагае яму тут лужыцкі філёлёг Лубэнскі.

Вельмі цікавы час пераживала тады ўся Эўропа. Ужо закончана была наполеонаўская эпопэя і Эўропа, напіраная неўмалімай сілай падзеяў, знайшлася ў констэляцыі рэвалюцыйных забурэньняў з аднаго боку і нацыянальных імкненьняў з другога. Вызвалілася ўжо Грэцыя, надыходзіла рэвалюцыя ліпнёвая, па якой мела прыйсьці *вясна народаў* –1848 год. Тое, што сталася фактам пазьней, заплоднівалася й бруняла ўжо значна даўней. Як-жа мог наш малады вучоны, чалавек шырокай і глыбокай думкі, раптам спрацівіцца гэтым здаровым, жыцьцёвым, сакавітым вясьняным імкненьням, каторымі аддыхаў у Эўропе поўнымі грудзьмі праз пяць гадоў, здалёку ад цесна шляхоцкага і прымітыўна патрыархальнага быту, у каторым спаў непрабудна яго родны край і, адданы прыемнасьці паляваньня і роскашы ўжываньня, асяродак вышэйшых слаёў грамадзянства? (Філярэты, філёматы, прамяністыя, а нават і шубраўцы іменна былі польскім пратэстам проціў гэткага зьявішча). Дык што-ж дзіўнага, што, як гэта відаць з далейшай працы М. Б. на прафэсарскай катэдры ўнівэрсытэту ў Вільні, вярнуўся ён з гэтай падарожы, *як гарачы* староньнік (там-жа, 128) усходняга абраду і як *выразны працаўнік пашыраньня польскіх рэлігійных кніжак сярод уніяцкага духавенства, каторае мела абавязак спаўняць царкоўныя абрады паводле ўсходняга рытуалу ў царк.-славянскай мове.* Бо-ж М. Б. ведаў добра, што польская духоўная кніжка дагэтуль заўсёды мела адзін вынік: польшчыла беларускі і ўкраінскі народ і лацінізавала іх.

Пляменьнік М. Баброўскага генэрал Баброўскі апісвае, што быццам Базыліяне, баючыся шкоднага ўплыву праф. М. Б., даносілі на яго міністру асьветы Галіцыну (там-жа, 129), вынікам чаго, бяз суду і сьледства, быў ён выдалены ў Жыровіцы да тых-жа Базыліянаў, пад надзор духоўнай улады. І тут ён ня быў бяздзейным: у гэтым часе адкрыў слаўны Супрасьльскі рукапіс

у Супрасьлі, куды, відаць, меў магчымасьць даяжджаць з Жыровіц. Гэтая ссылка трывала блізу два гады (1824—1826), пасьля якой М. Б. узноў вярнуўся на катэдру*).

Ужо на падставе вышэйсказанага накідаецца выснаў, што М. Баброўскі быў нятолькі вызнаўцам сваіх нацыянальных пракананьняў, але й мучанікам за іх. Не за польскасьць-жа ён цярпеў, але за сваю тагочасную „рускасьць", каторая ў Вільні і ў Віленшчыне, а так-жа ў Горадзеншчыне магла быць толькі адна — беларуская.

Выясьніць нам гэта Я. Белінскі яшчэ выразьней, калі прыточым з яго вось гэткі тэкст: ...„У Вільні, паміж акадэміцкай моладзьдзю некулькі было сьвяшчэньніцкіх сыноў, як Ігнат Даніловіч, *Міхал Баброўскі*, Антон Марціноўскі, Жэгота Онацэвіч, Плятон Сасноўскі і іншыя менш ведамыя. Гэтая моладзь знала троха старaславянскі язык, а так-жа троха *беларускі язык*, у каторым акты да Люблінскай Уніі былі пісаны выключна. *Даніловіч разбудзіў у іх ахвоту* шукаць рукапісных і друкаваных старaславянскіх забыткаў, а калі паўстала пры Унівэрсытэце Духоўная Галоўная Сэмінарыя, якая так-жа дастарчала краю многіх, больш-менш навукова выробленых, маладых уніяцкіх сьвяшчэньнікаў, — дык зьбіраньне славянскіх рукапісаў *пачалося ў шырокіх разьмерах і ў вялікім праменьні*" (курсыў наш). Калі праўда, што Даніловіч у іх асобах меў прыгатаваных і ахвотных памацнікоў, дык так-жа мусіць быць праўдай, што група сьвяшчэньніцкіх сыноў, што радзіліся і расьлі ў семьях сельскіх духоўнікаў і што тут прабывалі вольны ад навукі час, была сусім добра абазнаная з мовай беларускага народу, так блізкай да мовы актаў Вял. Княства Літоўскага. Інакш як-жа яны маглі быць Даніловічу сапраўды памоцныя і праводзіць інвэнтарызацыю гэных рукапісаў у такіх разьмерах і ў такім праменьні!..

Малады ўкраінскі дасьледчык царкоўнай мінуўшчыны Заходняй Украіны М. Тэршаковэць (Записки Чина Св. Василія Великого, т. III, вип. 3—4. Львів 1930. Бібліографія, бач. 714—715) цьвердзіць, што ў праф. М. Баброўскага працэс быў адваротны: дапусьціўся ён нацыянальнай апостазіі, але стаючыся *з украінца паляком*.

„Быў час—кажа М. Тэршаковэць — калі пад уплывам адпаведнага асяродзішча ў душы М. Б. абудзіліся дрэмячыя нацыянальныя пракананьні ці толькі пачуцьці, каторыя ў яго аднак ўзноў загінулі, калі ён знашоўся ў асяродзішчы іншым. Маю на думцы два яго выражэньні з 1819 г. Выражэньні гэтыя аб украінскай (рускай) народнай прыналежнасьці М. Б. знаходзяцца ў яго лістох да двух выдатных Чэхаў: ведамага Язэпа Доброўскага і Івана Цыммэрмана. У лісьце да першага з іх з 10.IV.1819 М. Б. падпісаўся гэтак: „*Michael Bobrowski Ruthenus*". У лісьце да дру-

*) W. Charkiewicz („Bez steru i busoli", Wilno 1929) гэтую кару ставіць у лучнасьці з працэсам філярэтаў.

гога з 1.V.1819 таксама назваў сябе, бо пісаў вось як: „*Joanni Zimmermano Bohemo Michael Bobrowski Ruthenus S. P. D.*". М. Тэршаковэць прыпісвае гэтыя народныя выяўленьні М. Бабpоўскага ўплывам тагачаснага прэпозыта ўніяцкай цэркры сьв. Барбары ў Вене Івана Сьнігурскага, пасьля заслужанага ўніяцкага ўладыкі ў Пярэмысьлі. „Як-жа мусіў—піша далей М. Тэршаковэць—быць зьдзіўленым той сам Доброўскі, калі па чатырох гадох з Вільні атрымаў ліст, у якім было напісана: „*Viro celeberrimo Jozepho Dobrowski Michael Bobrowski Polonus S. P. D. Vilnae pridie Calendas Quintiles A. MDCCCXXIII*"*). Дужа мусіў зьдзівіцца патрыарх славістаў, што на ўсход ад Прагі паважныя людзі ў працягу чатырох гадоў зьмяняюць нацыянальнасьць, як рукавічку... Ня гледзячы аднак на гэта, мусімо спагадаць нядолі М.Б., бо быў ён трагічнай ахвярай ліхалецьця нашай цэрквы і нашага народу. У лепшых варунках быў-бы ён надта цэнным працаўніком на ніве ўкраінскай навукі, усёроўна якой: сьвецкай ці духоўнай". Гэтулькі М. Тэршаковэць. Ад сябе можам дадаць, што ў адпаведных варунках М. Б. быў-бы ня менш цэнным працаўніком і на ніве беларускай навукі. Ведамыя й сяньня падобныя трагэдыі маладушных людзей.

Пасьля гэтага трэцяга лісту М. Б. жыў яшчэ 25 гадоў, каторыя сусім ня сьведчаць аб тым, каб яго польскасьць з часу 1823 г. паглыбілася. Якраз гэныя гады сьведчаць аб сусім адваротным. У 1823 г. назваў ён сябе паляком, але ў 1839 г. разам з Семашкам перайшоў у расейскае праваслаўе. Сусім аднак не перашкаджала гэта яму паміж гэтымі гадамі займацца пісаньнем і выдаваньнем між іншым падручнікаў катахізму для гімназіяў і павятовых школаў. Вось-жа, ці толькі не на гэты пэрыод прыпадае прыпісванае яму аўтарства (паводле праф. М. Біржышкі) беларускай катахізмоўкі, каторай 100-лецьце нядайна адзначала беларуская прэса. (Прыпісваньне-ж кс. В. Гадлеўскім аўтарства гэтай катахізмоўкі віленскаму лацінскаму біскупу А. Клонгевічу мала праўдападобнае).

Поўная супярэчнасьці асоба праф. М. Баброўскага, а так-жа й справа яго нацыянальнасьці, чакае яшчэ на выясьненьне. Сяньня можам толькі сказаць, што хоць М. Баброўскі паходзіў з зямель беларуска-украінскіх, хоць часам называў сябе агульным тады для беларусаў і украінцаў назовам *Ruthenus*— Русін, а часам нават Паляком, то аднак усей сваей дзейнасьцяй і навуковай працай, усім сваім жыцьцём ад моладасьці да сьмерці**) быў цалком зросшыся з лёсам беларускага народу.

---

*) Цытаты ўсіх трох подпісаў М. Б. узяты з працы В. А Францева „Польское словяновѣденіе". Прага 1906.

**) † 1848, Шэрашэва, Пружанскага пав.

Кнігапіс

Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук, кніжка 5. **Працы катэдры археолёгіі,** том I. Менск, 1928 г. Бач. 300*).

Археолёгія ў гісторыі ўсіх народаў, а асабліва народу беларускага, мае вялізарнае значэньне. Як ведама, падзеі народаў сягаюць далей у мінуўшчыну, чым гэта паказваюць пісьменныя памятнікі. Пісьменнымі памятнікамі могуць пахваліцца нямногія эўрапэйскія народы, дый тыя (напр. грэцкі або рымскі) ня маюць гэткіх памятнікаў ад самага свайго пачатку. Урэшце і пісьменныя памятнікі, якія дайшлі да нашых часоў, маюць часта свой бок гледжаньня і асьвятляюць падзеі даволі аднабока, часта вельмі скупа або нярaз і фальшыва. Як-жа напр. лепш мы цяпер знаем культуру скіфаў на падставе археолёгічных досьледаў, чым на падставе такога паважнага гісторыка, як Гэрадот, або ўзяць хаця-б культуру эгейскую, якую мы знаем толькі пры помачы выкапняў.

Вось-жа і гісторыя беларускага народу мае шмат нявыясьненых пытаньняў, на якія пісьменныя памятнікі нічога ня могуць адказаць, напр. аб славянскай прабацькаўшчыне, аб часе прыходу ў наш край беларускіх плямёнаў, аб граніцах іхнага расьсяленьня, аб іхняй культуры і г. д. На ўсе гэтыя пытаньні можа адказаць у вялікай меры археолёгія. Часам адзін агладжаны ці неагладжаны каменчык, адзін чарапок з такім ці іншым узорам, для вучоных археолёгаў мае вялікае значэньне. А Беларусь вельмі багата на памятнікі старасьветчыны: тысячы гарадзішч і дзесяткі тысяч курганаў раскіданы па яе палёх і лясох, але яны бязьлітасна зьнішчаюцца і людзьмі і часам... Трэба ратаваць тое, што яшчэ можна ўратаваць.

Добрую задачу ўзяў на сябе Інбелкульт, а потым Бел. Акадэмія Навук, што заняліся вывучэньнем нашай старасьветчыны, нашай прагісторыі. Перад намі ўжо ёсьць плады іхняй працы ў форме вялікіх сумленна апрацаваных і добра выданых кніг.

Том I, аб каторым тут гутарка, мае ў сабе такія навуковыя працы: „Археолёгічныя раскопкі ў Заслаўі“— Ляўданскага; „Асноўныя дыямэтры і тып сэрый чарапоў курганнага пэрыяду“ (Раскопкі ў Заслаўскім, Ухляскім і Менскім раёнах)—Сьмірнова; „За-

---

*) Кніжка гэтая, як бачым, выйшла яшчэ ў 1928 годзе, выдана Інстытутам Беларускае Культуры, пры якім была катэдра археолёгіі. Гэтая катэдра зператварэньнем Інстытуту Бел. Культуры ў Бел. Акадэмію Навук ператварылася ў Археолёгічную Камісію, якая сваім чарадом пры рэарганізацыі Акадэміі ў 1930 годзе была пераіменавана ў Сэкцыю археолёгіі, у якой цяпер працуе 3 сталых навуковых працаўнікоў. Рэцэнзія наша трохі спозьненая з тэй прычыны, што мы толькі цяпер змаглі гэту кніжку атрымаць у Вільні.—В.Г.

слаўе ў Меншчыне“ (Гістарычны экскурс) — Даўгялы; „Дагістарычныя стаянкі сярэдняга і ніжняга Сажа“ (па досьледах 1926 года) — Палікарповіча; „Дадатковыя раскопкі курганоў у Заслаўі“— Дубінскага.

Апроч гэтых навуковых артыкулаў ёсьць яшчэ абшырная хроніка і справаздача з археолёгічных працаў на Беларусі за 1919—1918 гады. І так маем: „Дзейнасьць арганізацый“—Дубінскага; „Досьледы культур каменнага і бронзавага пэрыядаў у Усходняй Беларусі“—Палікарповіча; „Досьледы культур жалезнага пэрыяду па Віцебшчыне, Магілеўшчыне і Меншчыне“— Дубінскага; „Археолёгічныя досьледы ў Смаленскай губэрні за 1918—1928 г.г.“—Ляўданскага. У канцы кнігі зьмешчаны геаграфічны паказьнік, які памагае ў знаходжаньні патрэбнай мясцовасьці, якая інтарасуе чытача і аб якой успамінаецца ў кнізе.

Зьмест кнігі, як бачым, багаты. Не хваціла-б нам месца, каб мы тут хоць павярхоўна разглядзелі кожны артыкул. Скажам толькі, што раскопы і досьледы курганаў зроблены вельмі сумленна. Пададзены ў тэксце рысункі знойденых рэчаў, пачынаючы ад глінянай пасуды, а канчаючы на розных пражках, засьцежках і г. д. Палічаны нават пацеркі, якія былі знойдзены пры жаночых касьцякох. Самыя касьцякі вымераны, сфатаграфаваны і пададзена акуратная тапаграфія месца, дзе ляжаў касьцяк і рэчаў, якія былі пры ім знойдзены. Разам з археолёгічнымі досьледамі робяцца вывады гістарычнага характару. Так напр., у артыкуле Ляўданскага „Арх. раскопкі ў м. Заслаўі“, чытаем, што „Заслаўе было адным з тых месц, дзе крывічы і дрыгавічы паміж сабою межаваліся“.

Заслугоўвае на ўвагу так-жа гістарычнага зьместу артыкул Даўгялы „Заслаўе на Меншчыне“. У гэтым артыкуле Даўгяла стараецца выясьніць, што расказ летапісу аб заснаваньні Заслаўя Валадзімерам для свайго сына Ізяслава, ня мае ніякай гістарычнай падставы. Апісаньне гэтага здарэньня, якое перадаў нам летапісец аб высылцы Валадзімерам Рагнеды і Ізяслава з Кіева ў Заслаўе, Даўгяла падае ў вершаванай форме старадаўнае быліны і цьвердзіць, што гэта ёсьць штучны старажытны беларускі песьнярскі эпічны твор, у якім злучана некаторая нізка паданьняў аб Рагнедзе-Гарыславе і гэты эпічны твор быў устаўлены летапісцам у летапіс. Дык на падставе гэтага Даўгяла адкідае дагадку аб закладзінах Заслаўя Валадзімерам і адносіць гэтыя закладзіны у пазьнейшыя часы.

На наш пагляд, калі-б нават і дапусьціць, што паданьне аб Рагнедзе, Ізяславе і заснаваньні гораду Заслаўя ёсьць штучным эпічным творам (былінай), які летапісец уставіў у свой летапіс, то астаецца адкрытым пытаньне, ці гэты эпічны твор ня меў сапраўднай гістарычнай падставы, на якой зрадзіўся і паўстаў? А гэтага Даўгяла ня выясьніў.

В. Г.

Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук, кніжка 11. Працы Археолёгічнай Камісіі, том II. Беларуская Акадэмія Навук. Менск, 1930. Бач. 536.

Гэты другі том саліднасьцю апрацоўкі і аб'ёмам робіць яшчэ большае ўражаньне, чым першы. Прыгледзімся толькі да загалоўкаў тых артыкулаў, якія зьмешчаны ў гэтым томе:

1. Г. Ф. Мірчынк. Геолёгічныя ўмовы знахадженьня палеолітычнай стаянкі каля в. Бердыжа на р. Сажы (Гомельшчына).
2. В. І. Громаў. Фаўна Бердыскай палеолітычнай стаянкі (па раскопках 1926—1927 г.г.).
3. А. Н. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў Аршанскай акрузе.
4. З. І. Даўгяла. Аршанскі замак. (Экскурс у гісторыю ўзьнікненьня яго ўмацаваньняў).
5. А. Н. Ляўданскі. Курганны магільнік каля в. Чаркасова, Аршанскай акругі.
6. С. А. Дубінскі. Чаркасоўскае гарадзішча пад Воршай.
7. " " Гарадзішча каля в. Германоў, Аршанскай акр.
8. І. А. Сербаў. Археолёгічныя помнікі Дубровенскага раёну, Аршанскай акругі. (Па матар'ялах, сабраных у 1928 годзе).
9. А. Н. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў Віцебскай акрузе.
10. С. С. Шутаў і М. М. Улашчык. Археолёгічныя разьведкі на ніжняй Сьвіслачы ўлетку 1926 г.
11. В. Р. Тарасенка. Археолёгічныя досьледы гарадзішч на Смаленшчыне ў 1926—1928 гг.
12. А. Зьм. Каваленя. Археолёгічныя разьведкі ў Магілеўскай, Бабруйскай і Менскай акругах.
13. А. Н. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе.
14. І. А. Сербаў. Археолёгічныя помнікі Ушацкага раёну, Полацкае акругі. (З матар'ялаў, сабраных экспэдыцыяй краязнаўчага т-ва Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў 1928 г.).
15. В. І. Громаў. Аб фаўне гарадзішч БССР і Смаленскай губ.
16. Н. І. Савін. Раскопкі курганоў у Дарагабускім і Ельнінскім паветах, Смаленскай губ.
17. А. Н. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў Барысаве.
18. Зьм. І. Даўгяла. Барысаўскі замак. (Экскурс у гісторыю яго ўзьнікненьня і ўмацаваньня).
19. А. Н. Ляўданскі. Археолёгічныя досьледы ў вадазборах р. р. Сажа, Дняпра і Каспලі ў Смаленскай губ.
20. А. Зьм. Каваленя і С. С. Шутаў. Матар'ялы з дагісторыі Тураўшчыны. (Разьведкі краязнаўчай экспэдыцыі Бел. Дзяр. Унівэрсытэту ў 1927 г.).
21. А. А. Сьмірноў. Новыя даныя аб чарапох курганнага пэрыоду.
22. К. М. Палікарповіч. Дагістарычныя стаянкі сярэдняга Сажа. Матар'ялы абсьледаваньня 1927 г.

23. С. М. Замятнін. Раскопкі Бердыскай палеолітычнай стаянкі ў 1927 г.

24. К. М. Палікарповіч. Нова-Бабовіцкая палеолітычная стаянка.

25. А. Н. Ляўдански. Да пытаньня аб палеолітычнай стаянцы ў в. Гамкове, Смаленскай акругі.

26. К. М. Палікарповіч. Раскопкі Юравіцкай палеолітычнай стаянкі ў 1929 г.

Далей ідзе багатая хроніка, а ў канцы геаграфічны паказьнік.

Як бачым, зьмест гэтага II тому вельмі багаты. Пры гэтым ёсьць шматлікія рысункі, фатаграфіі і пляны раскапаных мясцоў. Ёсьць так-жа археолёгічная карта Смаленшчыны і карта сярэдняга цеку р. Сажа, дзе былі дакананы археолёгічныя досьледы. Пры ўсей грунтоўнасьці працы трэба прызнаць, што і гэты том ёсьць вялікім укладам у навуку Беларусі. Вялікая шкада, што з нястачы месца мы ня можам іх разгледзіць падрабязна.

На найбольшую ўвагу заслугоўваюць бясспрэчна артыкулы, дзе гаворыцца аб знахаджэньні і раскопках палеолітычнай стаянкі каля в. Бердыжа на р. Сажы (Гомельшчына). Дагэтуль вучоныя думалі, што стаянак людзкіх з эпохі палеоліту (шчапанага, неагладжанага каменя) на Беларусі ня было, а былі толькі стаянкі з эпохі нэоліту (гладжанага каменя) і мэзоліту (нешта сярэдняе паміж шчапаным і абгладжаным каменем). Тымчасам ў 1926—29 гадох былі акуратна дасьледаваны дзьве палеолітычныя стаянкі: адна (як мы ўжо ўспаміналі) каля в. Бердыжа, а другая ў м. Юравічах на Прыпяці (каля Мозыра). З выкапняў вучоныя гадаюць аб людзях, якія там жылі, і аб іх культуры.

В. Г.

Хроніка

— 18.XI адбыўся ў Вільні („Ognisko Akademickie“) Вечар беларускай песьні, на якім рэфэрат аб бел. народнай песьні прачытаў гр. Цітовіч, а квартэт сьпевакоў, пад кіраўніцтвам таго-ж Цітовіча, задэманстраваў прысутным некалькі бел. народн. песьняў.

— 21-га лістапада віленская радыёстанцыя надавала канцэрт беларускай народнай песьні. Хор гр. Р. Шырмы прапяяў, як заўсёды добра, некалькі беларуск. народн. песьняў.

— 24.XI. у віленскім цэнтральным гуртку Т-ва Беларускай Школы адбылася лекцыя гр. Р. Шырмы на тэму: „Уплывы літаратуры на жыцьцё грамадзянства і адзінкі“.

— 30.XI. Цэнтральны Урад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ладзіў у сваей залі (Вільня, Завальная 1—1) урачыстую акадэмію дзеля ўшанаваньня 25-ых угодкаў сьмерці беларускага вучонага этнографа Міколы Нікіфароўскага (памёр 28 траўня, старога стылю, 1910 году). Рэфэрат на акадэміі прачытаў сябра Рэдакцыйнай Калегіі „Калосься“ гр. М. Пяцюкевіч. Друкуем рэфэрат, у скарочаным выглядзе, у гэтай кніжцы часапісу. Па рэ-

фэраце Хор Бел. Інст. Гасп. і Культуры хораша прапяяў некалькі народных беларускіх песьняў.

— Дня 1-га сьнежня адбылося ў Вільні ўрачыстае святкаваньне 15-годзьдзя існаваньня Бел. Студ. Саюзу. У залі Сьнядэцкіх віл. унівэрсытэту была наладжана юбілейная акадэмія, у праграму якой увашлі: прамова старшыні БСС. М. Шчорса, рэфэраты – інформацыйны і ідэолёгічны—і прывітаньні.

Па акадэміі ў тэй-жа залі адбыўся канцэрт бел. песьні. Хор гр. Р. Шырмы памастацку выканаў некалькі народных песьняў і пакладзеных на музыку вершаў нашых лепшых паэтаў.

— Quot capita, tot sensus. — 8-га сьнежня адбыўся ў Т-ве Беларусаведы пры віленскім унівэрсытэце крытычны разбор аповесьці В. Адважнага – „Chłapiec“. „Крытыкі“ (Хв. Ільляшэвіч, Ст. Станкевіч і П. Засім) — як-бы змовіўшыся — не знайшлі ў аповесьці нічога вартаснага... Усім аднак ведама, што творчасьць В. Адважнага вызначаецца чысьцінёй беларускага языка, простым стылем, сьвежасьцю, ня кажучы ўжо аб іншых вартасьцях, – а сам аўтар вызначаецца не абыякім талентам.

— У пачатку сьнежня прыяжджаў у Вільню адзін з перадавых паэтаў Заходняй Беларусі і супрацоўнік „Калосься“ Міхась Машара. Поэт цікавіўся беларускім мясцовым жыцьцём. У гутарцы з некаторымі сябрамі рэдакцыі нашага часапісу, Машара выявіў стан і пляны сваей творчай працы на літаратурнай ніве. Паміж іншымі літаратурнымі працамі, ужо распачатымі, поэт прадаўжае працу над поэмай „Мамчына горка“, пабудаванай галоўным чынам на матывах беларускага фольклёру.

— Дня 26-га сьнежня сёлета адкрыецца ў Вільні (вул. Міцкевіча 7) выстаўка абразоў — малярства і рысункаў—беларускага мастака Пётры Сергіевіча. Выстаўка патрывае да 8.I.36 г.

— Сёлета ў сьнежні м. віленскі штодзенны польскі часапіс „Słowo“ арганізаваў субскрыпцыю на працы маладых графікаў – студэнтаў віленскага ўнівэрсытэту. Другое месца ў субскрыпцыі па колькасьці заказаў на абразы заняў беларускі мастак Чурыла.

— У Беларускім Навуковым Таварыстве ў Вільні ў сэкцыі гістарычнай адбылося ў бягучым квартале некалькі зборак, на якіх прачыталі рэфэраты: гр. В. Грышкевіч, гр. М. Мілючанка і др. Чарнэцкі.

— Кіраўнік Інстытуту Антраполёгічных і Этнолёгічных Навук у Кракаве праф. Станіслаў Панятоўскі разам з праф. Ч. Петкевічам апрацавалі і скончылі друкаваньне IV тому монумэнтальнай працы беларускага этнографа Міхала Фэдэроўскага – „Lud Białoruski“. Гэты том абымае прыслоўі. Надрукаваны ў № 1 публікацыі „Prace Etnologiczne Instytutu Nauk Antropologicznych i Etnologicznych“. Гэныя-ж прафэсары прыступілі да апрацаваньня дальшых—V і VI—тамоў „Ludu Białoruskiego“, што абымаюць беларускія песьні.

— Магістэрская праца беларуса гр. Якіма Скурата (скончыў віленскі ўнівэрсытэт у 1934—35 акад. годзе) „Le Romantisme de Flaubert“, нагароджана — нагародай ім. бэльгійскай літараткі Флёры Розэнталь у суме 2.400 зл. польск. Аўтор цьвердзіць, што шэф францускай рэалістычнай (позытывістычнай) школы быў фактычна рамантыкам, а дзеля гэтага — XIX век у францускай літаратуры ня можна дзяліць, як гэта робіцца дагэтуль, на тры школы: романтычную, позытывістычную і сымболістычную:— у XIX в. у францускай літаратуры была адна школа—романтычная — з адхіленьнямі, залежнымі ад навуковых і політычных мамэнтаў.

— Пры Беларускай Акадэміі Навук у Менску ўтворана сталая фольклёрная камісія на чале з віцэпрэзыдэнтам Бел. Ак. Нав. Якубам Коласам. У камісію ўходзяць акадэмікі: Шчарбакоў і Нікольскі, пісьменьнікі: Янка Купала, Лыњкоў, Александровіч, Харык, Клімковіч, Браништэйн і кампазытар Любан.

— Кінофабрыка „Савецкая Беларусь“ выпусьціла новы дзіцячы фільм „Дзеці сонца“ (сцэнарый Гаўронскага і Таўбэ, рэжысары Пракоп'еў і Кажура, апэратары Гарэлік і Райхельсон).

— Тая-ж кінофабрыка выпусьціла навучальны фільм аб фізычнай географіі Савецкай Беларусі. Фільм дзеліцца на 19 лекцыяў. Першыя дзьве лекцыі—уступныя—аб мінуўшчыне і сучаснасьці Сав. Беларусі. Ад трэцяй лекцыі пачынаецца географія—тэрыторыя, насельніцтва, рэльеф, глеба, клімат, рэкі, вазёры, расьціннасьць і жывёльны сьвет, гарады. Карты, дыяграмы і картаграмы пераплятаюцца тут з здымкамі прыроды і мультыплікацыяй. Аўторы фільма: сцэнарыст Ф. Круглікаў, рэжысары Л. Пуш і Ю.Стальмакоў, консультанты Стральцоў і Благавідаў, апэратары Шапіра і Мэндэм, мультыплікатар Усьцінаў.

— Навуковы працаўнік Беларускага Навукова-дасьледчага Інстытуту харчовай прамысловасьці ў Менску А. С. Вечар скончыў нядаўна досьледы дзеля атрыманьня з морхвы правітаміну „А“, які зьяўляецца надзвычай эфэктыўнай крыніцай вітаміну „А“—вітаміну росту. Досьледы праўджаны ў лябораторным маштабе. Паводле апініі Белар. Акадэміі Навук праца Вечара мае значную вартасьць з гледзішча тэорэтычнага і практычнага.

— Інстытут Эканомікі Беларускай Акадэміі Навук (сэкцыя эканамічнай географіі) скончыў працу над дапаможнікам у галіне эканамічнай географіі БССР; інстытутам зложаны для вялікага савецкага атласу сьвету дзьве карты БССР: эканамічная і нацыянальная. Галоўнай працай інстытуту зьяўляецца выданьне вялікага географічнага атласу БССР (122 карты на 50 аркушах-разваротах, апрача карт з фізычнай географіі (кліматычных, глебавых, геоботанічных, зоагеографічных, гіпсамэтрычных і інш.), а таксама карт дзеля вывучэньня прыродных багацьцяў БССР). Палова праграмы ў гэтым кірунку Інстытут ужо выканаў.

— Усебеларускі (Сав. Беларусь) Конкурс на лепшую п'есу для гарадзкой і калгаснай сцэны—распісаны сёлета—ня даў пажаданых вынікаў:—п'есы прысланы ня ў значным ліку і якасна слабыя.

Ад Рэдакцыі:

Наступная кніжка „Калосься“ выйдзе з друку у другой палавіне 1-га кварталу 1936 году. Набор гэтай кніжкі ў друкарні пачнецца 15 га студня. У сувязі з гэтым, Рэдакцыя просіць сваіх супрацоўнікаў найхутчэй прысылаць матар'ялы: да літаратурнага аддзелу найпазьней да 15-га студня; да навуковага аддзелу—найпазьней да 1. II. 1936.

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры

Рэдакцыйная Калегія: М. Шкялёнак, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Ад. Станкевіч, Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня, бач. 128, Вільня 1935.

D. Aniśko, Da Biełaruskaha Narodu, бач. 40, Вільня 1935.

Ks. dr. J. Tarasewič, Biełarusy ŭ światle praŭdy, бач. 40, Вільня 1935.

Dr. Stanisłaŭ i dr. Jadwiha Hrynkiewičy, Rady chworym i zdarowym, č. 1. Ab zaraznych i inšych chwarobach, бач. 119, Вільня 1935.

Ул. Казлоўшчык, Шляхам Змаганьня, бач. 61, Вільня 1935.

Беларускі Адрыўны Календар на 1936 год.

Беларускі Народна-гаспадарскі Календар на 1936 г. (кніжка).

Biełaruski Narodny Kalendar na 1936 hod (кніжка).

Беларускі Календар на 1936 г. (кніжка).

Chryścijanskaja Dumka, №№ 1—12, Вільня 1935.

Самапомач, №№ 1—12, Вільня 1935.

Шлях Моладзі, №№ 1—12, Вільня 1935.

Беларуская Борць, № 6, Вільня 1935.

Księga Pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetletniej rocznicy wydania Statutu Litewskiego. Rozprawy Wydziału III Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie, tom VIII, str. 362. Вільня 1935.

Wanda Rewieńska, Wileński węzeł kolejowy w świetle cyfr, бач. 15, Вільня 1935.

Jan Otrębski, O najdawniejszych polskich imionach osobowych, бач. 82, Вільня 1935.

Anatol Mirowski, Die Aspektfrage im Gotischen, бач. 51, Вільня 1935.

Jan Jerzy Tochtermann, Troki, бач. 24, Вільня 1935.

Franciszek Olechnowicz, Siedem lat w szponach GPU, бач. 168, Вільня 1935.

Рідна Мова, ч. 12, Варшава 1935.

Дзвони, ч. 11, Львоў 1935.

Шлях нацыі, ч. 8, Львоў 1935.

Український Бескид, ч.ч. 37—49, Перамышль 1935.

Prehled, č. 17, 19, Прага 1935.

Život, č č. 21, 22, 23, Прага 1935,

Slovansky Prehled, č. 7, 9, Прага 1935.

Oriens, zeszyt 6, Кракаў 1935.

Bunt Młodych, Nr. 23—24, Варшава 1935.

Poprostu, Nr. Nr. 8, 9, 10, Вільня 1935.

Pax, N rNr. 14, 15, 16, 17—18, Вільня 1935.